МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАГРАМЫ ПА ГІСТОРЫІ для базавых агульнаадукацыйных школ

Curricula für Geschichte in allgemeinbildenden „Basisschulen"

Minsk, 95

BY
Z-3
(1,95)

МІНСК 1995

Georg-Eckert-Institut BS78
1 234 042 1

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАГРАМЫ ПА ГІСТОРЫІ для базавых агульнаадукацыйных школ

*Зацверджаны Міністэрствам адукацыі і навукі
Рэспублікі Беларусь*

НМЦентр
Выставочный
экземпляр

МІНСК «АРАКУЛ» 1995

ББК 74.266.3я7
П 78
УДК 373.121.4:930.9(073.3)

Складальнікі праграм

**Па сусветнай гісторыі:**
І. В. Аржахоўскі, Н. М. Ганушчанка, Г. І. Даўгяла, Г. А. Космач, У. С. Кошалеў, Р. Р. Лазько, К. А. Рэвяка, У. Н. Сідарцоў, В. А. Фядосік, П. А. Шупляк, А. А. Яноўскі

пад навуковай рэдакцыяй У. С. Кошалева.

**Па гісторыі Беларусі:**
М. В. Біч, Н. М. Ганушчанка, П. А. Лойка, В. М. Фамін, Г. В. Штыхаў

пад навуковай рэдакцыяй М. В. Біча.

Georg-Eckert-Institut
für internationale
Schulbuchforschung
Braunschweig
-Schulbuchbibliothek-
98 | 809

© Міністэрства адукацыі і навукі
Рэспублікі Беларусь, 1995

BY
Z-3(1,95)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Сістэма адукацыі і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь накіравана сёння на рознабаковае развіццё асобы, дыферэнцыраванае навучанне і ўздым культуры выпускнікоў школы. Гэта патрабуе карэнных зменаў зместу, структуры і методыкі вывучэння гісторыі ў агульнаадукацыйных школах рэспублікі. З 1993/94 навучальнага года ўстаноўлены наступны парадак яе вывучэння ў 5—9 класах:

**5 клас** — гісторыя цывілізацый Старажытнага свету (да V ст. н. э.) — 2 гадзіны ў тыдзень у першым паўгоддзі і 1 гадзіна — у другім, усяго — 51 гадзіна; гісторыя Беларусі старажытных часоў (да канца V ст. н. э.) — 1 гадзіна ў тыдзень у другім паўгоддзі, усяго — 17 гадзін.

**6 клас** — гісторыя сярэдніх вякоў (канец V — XV ст.) — 1 гадзіна ў тыдзень у першым паўгоддзі і 2 гадзіны — у другім, усяго — 51 гадзіна; гісторыя Беларусі сярэдніх вякоў (VI — XV стст.) — 1 гадзіна ў тыдзень на працягу года, усяго — 34 гадзіны.

**7 клас** — сусветная гісторыя новага часу (XVI — XVIII стст.) — 2 гадзіны ў тыдзень у першым паўгоддзі і 1 гадзіна — у другім, усяго — 51 гадзіна; гісторыя Беларусі новага часу (XVI — канец XVIII ст.) — 1 гадзіна ў тыдзень на працягу года, усяго — 34 гадзіны.

**8 клас** — сусветная гісторыя новага часу (XIX ст.— 1918 г.) — 1 гадзіна ў тыдзень у першым паўгоддзі і 2 гадзіны — у другім, усяго — 51 гадзіна; гісторыя Беларусі новага часу (канец XVIII ст.—1917 г.) — 1 гадзіна ў тыдзень на працягу года, усяго — 34 гадзіны.

**9 клас** — сусветная гісторыя навейшага часу (з 1918 г. да нашых дзён) — 2 гадзіны ў тыдзень у пер-

шым паўгоддзі і 2 гадзіны — у другім, усяго — 68 гадзін; гісторыя Беларусі навейшага часу (з 1917 г. да нашых дзён) — 1 гадзіна ў тыдзень на працягу года, усяго — 34 гадзіны.

Праграмы, што прыводзяцца ніжэй, з'яўляюцца базавымі. Яны прыкладна вызначаюць аб'ём ведаў па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі і адпавядаюць пазнавальным магчымасцям вучняў звычайных, негуманітарных класаў. Гэты ўзровень навучання ўключае ў сябе даступны і дастатковы аб'ём ведаў па гісторыі, які неабходны кожнаму жыхару нашай рэспублікі.

Гістарычная адукацыя заклікана ўнесці значны ўклад у фарміраванне сацыяльна актыўнай, гарманічнай і творчай асобы, якая павінна садзейнічаць захаванню і развіццю культуры, звычаяў, норм маралі і права свайго і іншых народаў, можа крытычна аналізаваць мінулае і сучаснае, свядома арыентавацца ў грамадскім жыцці. Для дасягнення гэтых мэр неабходна:

узбагаціць духоўны свет школьнікаў звесткамі аб асноўных, найбольш важных падзеях, з'явах, датах, імёнах, паняццях, заканамернасцях, ідэях і іншых элементах гістарычных ведаў; садзейнічаць асэнсаванню вучнямі старэйшых класаў тэарэтычных асноў сусветна-гістарычнага працэсу і айчыннай гісторыі;

развіваць уменні адшукваць прычынна-выніковыя сувязі гістарычных працэсаў і падзей, вызначаць фактары, што абумовілі тэмпы, характар і асаблівасці развіцця розных краін і народаў;

садзейнічаць выхаванню свядомага чалавека-гуманіста, патрыёта і інтэрнацыяналіста, адказнага грамадзяніна, які ведае і паважае гісторыю і культуру свайго народа, з разуменнем і добразычлівасцю ставіцца да іншых народаў, іх культуры і звычаяў;

фарміраваць высокамаральную, духоўна прасветленую, грамадзянскі сталую асобу, якая ўсведамляе прыярытэт агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей перад класавымі, партыйнымі, групавымі і асабістымі інтарэсамі, шкоднасць манапалізму ў любой сферы чалавечай дзейнасці;

развіваць у вучняў гістарычнае мысленне, агульнанавучальныя, інтэлектуальныя і спецыяльныя ўменні, якія неабходны ім для самастойнага вывучэння

розных гістарычных крыніц, папаўнення і выкарыстання ведаў па айчыннай і сусветнай гісторыі;

абудзіць імкненне да ўдасканалення сваёй асобы і павышэння сваёй маральнай, экалагічнай, эстэтычнай, палітычнай і прававой культуры, засваення нацыянальных традыцый і звычаяў, адчування асабістай адказнасці за далейшы лёс Бацькаўшчыны.

Для паспяховай рэалізацыі адзначаных мэт і задач вывучэння гісторыі прапануецца прынцыпова абноўлены змест школьных праграм. Вызначальны накірунак праграм — гуманізацыя ўсіх курсаў гісторыі, плюралістычная тэорыя і метадалогія, якія грунтуюцца на творчым асэнсаванні і засваенні розных канцэпцый сусветна-гістарычнага працэсу, апрабіраваных часам і вопытам чалавецтва. Праграмы арыентуюць на вывучэнне не абстрактных, надуманых схем і догм, а чалавека, яго жыцця і дзейнасці ў розныя гістарычныя эпохі і ў розных аспектах — вытворчых, сямейна-бытавых, культурных, грамадска-палітычных, дэмаграфічных, экалагічных і інш.

Разуменне вучнямі агульначалавечых, нацыянальных, групавых, індывідуальных каштоўнасцей будзе садзейнічаць пераадоленню схематызму і дагматызму ў гістарычнай адукацыі, дазволіць усебакова разгледзець і ацаніць вывучаемыя падзеі і з'явы. Гістарычная адукацыя не павінна з'яўляцца сродкам насаджэння ідэалогіі якой-небудзь партыі.

Змест праграмы адпавядае сучасным дасягненням гістарычнай навукі, у тым ліку распрацоўкам замежных вучоных. Звернута ўвага на многія «белыя плямы» ў сусветнай гісторыі і ў гісторыі беларускага народа. У праблемным, параўнальным і альтэрнатыўным плане сфармуляваны многія пытанні гістарычнага развіцця.

У аснове праграм па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі ляжыць ідэя паступальнага і супярэчлівага развіцця грамадства. Аптымальным варыянтам пабудовы курсаў гісторыі прызначана спалучэнне цывілізацыйнага і фармацыйнага прынцыпаў.

Цывілізацыйны падыход дазваляе па-новаму разглядаць сусветна-гістарычны працэс. Цывілізацыя, як вядома, з'яўляецца больш устойлівай структурай, чым грамадска-эканамічныя фармацыі. Могуць змяняцца фармацыі, праходзіць рэвалюцыі, адбывацца іншыя значныя з'явы ў гісторыі, а цывілізацыі застаюцца

на доўгі час устойлівымі гістарычнымі рэаліямі. Вывучаючы цывілізацыі, можна паспяхова выкарыстоўваць розныя метадалагічныя тэорыі і канцэпцыі. Толькі плюралістычная метадалогія гістарычнага працэсу забяспечвае найбольш дакладнае адлюстраванне гісторыі грамадства. Такі падыход стварае магчымасць для выяўлення шматукладнасці сацыяльна-эканамічных адносін і ролі духоўнага жыцця грамадства, разумення гісторыі як адзінага, цэласнага працэсу.

Важнейшыя гістарычныя факты выкладаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці. Асноўныя падзеі і з'явы асвятляюцца разгорнута, з характарыстыкай іх удзельнікаў. Звесткі, неабходныя для ўстанаўлення сувязі паміж асноўнымі фактамі, выкладаюцца фрагментарна і канспектыўна. Узмоцнена маральная накіраванасць аналізу і ацэнак гістарычных фактаў.

Прынцыповыя змены адбыліся ў асвятленні палітычнай гісторыі, характарыстыцы тыпаў і форм дзяржаўнай улады, унутранай і знешняй палітыкі, войнаў, сацыяльных і нацыянальных рухаў, паўстанняў і рэвалюцый.

Значнае месца ў праграмах па гісторыі адведзена пытанням эканамічнага развіцця ў розныя гістарычныя эпохі. Асаблівая ўвага ўдзелена працоўнай дзейнасці людзей, іх заняткам і эканамічным інтарэсам, удасканаленню сродкаў працы, формам уласнасці, развіццю рыначнай эканомікі і прадукцыйнасці працы, рацыянальнаму выкарыстанню прыродных багаццяў, ахове навакольнага асяроддзя, характару размеркавання матэрыяльных і духоўных даброт аў.

Істотна перагледжаны падыход да вывучэння гісторыі культуры. Праграмы пазбаўлены ад ранейшай недаацэнкі гэтай праблематыкі, бо ў сферы культуры ў канцэнтраванай форме праяўляюцца ўсе бакі жыцця і дзейнасці чалавека, сацыяльна-эканамічнага і дзяржаўнага ладу краіны. У сувязі з гэтым прапанавана разам з адукацыяй, навукай, грамадскай думкай, літаратурай і мастацтвам вывучаць культуру працы, побыту, сямейных адносін, адзення, жылля і пасяленняў і г. д.

Асаблівая ўвага надаецца азнаямленню вучняў з укладам беларускай культуры ў скарбніцу культуры сусветнай. Пры вывучэнні пытанняў культуры раскрываюцца асаблівасці гістарычных умоў і пераемнасць ў--яе развіцці. Характарызуецца творчасць вядомых

дзеячаў культуры, асноўныя дасягненні ў развіцці адукацыі, навукі і мастацкай культуры, іх узаемасувязь з сацыяльна-эканамічным і палітычным жыццём. Разам з пытаннямі культуры вывучаецца і рэлігія як адна з форм грамадскай свядомасці і асноў цывілізацыі.

Вывучэнне гісторыі ў 9-гадовай школе пачынаецца з урокаў па гістарычнаму краязнаўству ў 1—3 класах. У 4 класе ўводзіцца інтэграваны курс «Мая Радзіма — Беларусь». Змест гэтага курсу накіраваны на пашырэнне ведаў вучняў аб прыродзе, насельніцтве, гаспадарцы і гісторыі сваёй мясцовасці і краіны.

Гісторыя Беларусі як сістэматычны курс вывучаецца з 5 класа паралельна, сінхронна і ў кантэксце сусветнай гісторыі ў якасці самастойнага прадмета. Яна, як і іншыя курсы гісторыі, павінна асвятляцца ў школах Рэспублікі Беларусь з дзяржаўных пазіцый. Пры гэтым улічваецца, што кожны цывілізаваны народ мае свой погляд на ўласную гісторыю, а таксама на гісторыю суседніх і іншых народаў, што нацыянальная гістарыяграфія з'яўляецца адной з важнейшых і неад'емных частак нацыянальнай культуры, асновай гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці.

Вывучэнне курса айчыннай гісторыі ў 5—9 класах павінна садзейнічаць нацыянальна-культурнаму адраджэнню беларускага народа праз пазнанне непаўторнасці яго гістарычнага шляху, матэрыяльнай і духоўнай культуры, праз усведамленне яе нацыянальнай каштоўнасці ў суквецці славянскай, еўрапейскай і сусветнай культуры. Гэты курс павінен закласці аснову для фарміравання нацыянальнай свядомасці, пачуццяў нацыянальнай годнасці і гордасці, выхавання чалавека-грамадзяніна, добрага гаспадара на сваёй зямлі, адказнага за вынікі сваёй дзейнасці і перад сучаснікамі, і перад нашчадкамі.

Вывучэнне айчыннай гісторыі цесна звязана з беларускай мовай і літаратурай, геаграфіяй Беларусі, мастацтвам і іншымі прадметамі. Чым больш шырока і поўна будуць паказаны гэтыя сувязі, тым глыбей усвядомяць вучні развіццё гістарычнага працэсу.

Выкладанне сусветнай гісторыі мае мэтай раскрыць асноўныя моманты гісторыі галоўных цывілізацый, а таксама паказаць іх узаемаадносіны і ўзаемасувязі. Такім чынам, у праграмах па-новаму асветлены ад-

носіны Захад — Усход, месца ўсходніх цывілізацый у сусветнай гісторыі.

Перагледжана таксама перыядызацыя сусветнай гісторыі. У прыватнасці, за пачатак новага часу, як правіла, бярэцца XVI стагоддзе. Эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў і звязаная з ёю каланіяльная экспансія еўрапейскіх краін паклала пачатак станаўленню ўзаемазалежнасці і адзінства розных рэгіёнаў свету. На змену ранейшай замкнутасці і ізаляцыі прыходзіць усебаковая сувязь нацый. Скарбы духоўнай і матэрыяльнай культуры асобных народаў уключаюцца ў агульны працэс развіцця чалавечага грамадства. Аднак сутыкненні і кантакты краін Усходу з Захадам адбываліся не ў аднолькавых формах і неадначасова. Тым не менш умяшанне Еўропы ўсюды і непазбежна стымулявала развіццё капіталістычных адносін і аказвала адпаведны культурны ўплыў. Французская буржуазная рэвалюцыя канца XVIII ст. адзначаецца як рубеж, які падзяляе гісторыю новага часу на два перыяды.

Вывучэнне гісторыі на базавым узроўні можа быць паспяховым пры выкарыстанні такіх форм і метадаў навучання, якія абуджаюць самастойную думку ў вучняў (урокі рашэння праблемных задач, семінары, дыскусіі, канферэнцыі). Выкладанне гістарычнага матэрыялу павінна быць не толькі цікавым і эмацыянальным, але і вучыць думаць, суперажываць. У гэтым плане важна ставіць школьнікаў у пазіцыю маральнага выбару, адстойвання сваіх поглядаў і пераканання. Неабходна таксама супастаўленне розных пунктаў гледжання на гістарычныя падзеі і з'явы. Методыка вывучэння гісторыі на базавым узроўні павінна нацэльваць школьнікаў на самастойны аналіз гістарычных фактаў, іх параўнанне і абагульненне, падрыхтоўку паведамленняў і дакладаў, кароткіх аглядаў, збор і афармленне краязнаўчага матэрыялу.

Вучэбна-выхаваўчы працэс павінен быць гуманістычным і дэмакратычным. За вучнямі прызнаецца права на ўласнае меркаванне і на іхны ўдзел у паляпшэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу. Але незалежна ад узроўню самастойнасці школьнікаў настаўнік кіруе іх пазнавальнай дзейнасцю. Ён устанаўлівае пэўны тэмп навучання і віды дапамогі вучням пры вывучэнні гістарычнага матэрыялу, першакрыніц, публіцыстыкі і мастацкіх твораў на гістарычныя тэмы.

Настаўнік сваім асвятленнем праблемы, пастаноўкай пытанняў, логікай аналізу гістарычных фактаў і іх ацэнак рыхтуе вучняў да творчых заняткаў. Зыходны прынцып тут вельмі просты і бясспрэчны: чалавек валодае толькі тым, што здабывае ўласнай працай. Гэта адносіцца і да набыцця ведаў па дыскусійных праблемах, якія павінны асвятляцца з розных пунктаў гледжання.

Настаўніку неабходна ўлічваць не толькі ўзроставыя, але і індывідуальныя асаблівасці вучняў. Для гэтага ў праграмах курсаў выдзяляецца асноўны і дадатковы матэрыял.

Час, які адводзіцца ў праграмах на вывучэнне раздзелаў і тэм, з'яўляецца прыкладным. Настаўнік можа змяніць колькасць гадзін на асобныя тэмы і раздзелы ў межах навучальнага года, захоўваючы агульныя прапорцыі ў суадносінах гадзін паміж курсамі.

# 5 КЛАС

## ГІСТОРЫЯ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ

### 51 гадзіна (у тым ліку 3 гадзіны — рэзервовы час)

**Уводзіны (1 г)**

**Што такое гісторыя?** Чаму гісторыю патрэбна ведаць? Крыніцы нашых ведаў па гісторыі. Што вывучае гісторыя старажытнага часу?

Як карыстацца падручнікам і гістарычным атласам?

**Лік гадоў у гісторыі.** Як лічылі час у старажытнасці?. Сучасны лік часу ў гісторыі. Наша эра. Стужка часу. Задачы па ліку гадоў у гісторыі.

### Раздзел I

### ЖЫЦЦЕ ПЕРШАБЫТНЫХ ЛЮДЗЕЙ (4 г)

**Тэма 1. Першабытныя паляўнічыя і збіральнікі (2 г)**

**Жыццё першабытных людзей.** Продкі чалавека. Першабытныя людзі. Прылады працы і заняткі першабытных людзей. Авалоданне агнём.

Пахаладанне на Зямлі. Павелічэнне ролі палявання. З'яўленне чалавека сучаснага тыпу. Узнікненне радавой абшчыны. З'яўленне рас.

**Узнікненне мастацтва і рэлігійных уяўленняў.** Старажытныя людзі ў прыродным асяроддзі. Узнікненне мастацтва і яго раннія формы. Рэлігія.

**Тэма 2. Першабытныя земляробы і жывёлаводы (2 г)**

**Узнікненне земляробства і жывёлагадоўлі.** Пацяпленне на Зямлі і яго ўплыў на жыццё людзей. Новыя вынаходствы і адкрыцці «чалавека разумнага». Узнікненне земляробства. Прыручэнне жывёл. (Жыццё ў

першых пасёлках земляробаў і жывёлаводаў.)* Род і племя.

**Завяршэнне радавога ладу.** Узнікненне рамяства. Адкрыццё апрацоўкі металаў. Пераход да вандроўнай жывёлагадоўлі і плужнага земляробства. З'яўленне суседскіх абшчын. Узнікненне маёмаснай няроўнасці паміж плямёнамі. (Выдзяленне знаці.)

## Раздзел II

## КРАІНЫ СТАРАЖЫТНАГА УСХОДУ (17 г)

### Тэма 3. Старажытны Егіпет (7 г)

**Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта.** Геаграфічнае становішча. Засяленне даліны Ніла. Роля ракі Ніл у жыцці егіпцян. Прыродныя багацці краіны.

**Асноўныя заняткі старажытных егіпцян.** Земляробства — асноўны занятак егіпцян. Развіццё абвадняльнага земляробства. Рамяство і абмен.

**Утварэнне дзяржавы ў Старажытным Егіпце.** Завяршэнне радавога ладу ў Егіпце. Узнікненне номавых дзяржаў. Утварэнне егіпецкай дзяржавы. Будаўніцтва пірамід і Вялікі сфінкс.

**Пераўтварэнне Егіпта ў сусветную дзяржаву.** Егіпет пасля будаўніцтва вялікіх пірамід. Навакольны свет. Вызваленчая барацьба супраць гіксосаў. Пераўтварэнне Егіпта ў магутнейшую дзяржаву. (Будаўніцтва ў інтарэсах фараона, знаці, жрацоў.)

**Асноўныя рысы старажытнаегіпецкай рэлігіі.** Жывёлы-багі. Вера ў замагільнае жыццё. Абагаўленне фараонаў. Абагаўленне ракі Ніл.

**Навука і адукацыя ў Старажытным Егіпце.** Выдатнае месца егіпецкай навукі ў старажытным свеце. Пісьменнасць. Медыцына. Матэматыка.

**Літаратура, архітэктура і мастацтва ў Старажытным Егіпце.** Літаратура, яе асноўныя жанры. Егіпецкая архітэктура, скульптура, рэльеф, жывапіс.

### Тэма 4. Краіны старажытнай Пярэдняй Азіі (6 г)

**Адкрыццё старажытных дзяржаў Пярэдняй Азіі.** Першыя звесткі аб старажытным Міжрэччы. Археалагічныя знаходкі ў далінах рэк Тыгра і Еўфрата. Аб чым апавядаюць клінапісныя тэксты.

---

* Тэкст, змешчаны ў дужках, рэкамендуецца як дадатковы і выкарыстоўваецца настаўнікам па яго меркаванню.

**Міжрэчча перад узнікненнем першых дзяржаў.** Геаграфічны стан, клімат і прыродныя багацці. (Іх абмежаванасць.) Земляробства — асноўны занятак жыхароў старажытнага Міжрэчча.

**Старажытныя дзяржавы Міжрэчча.** Узнікненне гарадоў-дзяржаў у Паўднёвым Міжрэччы. Што расказалі знаходкі ў царскіх грабніцах горада Ура. Узвышэнне Вавілонскага царства. Законы цара Хамурапі.

**Пярэдняя Азія ў першай палове І тысячагоддзя да н. э.** Пачатак жалезнага веку. Узвышэнне Асірыі. Старажытныя арыі. Утварэнне Персідскай дзяржавы.

**Фінікія і Палесціна ў старажытнасці.** Геаграфічны стан, прыродныя багацці. Фінікія ў III—II тысячагоддзях да н. э. (Галоўныя гарады-дзяржавы.) Прыход філістымлян і яўрэяў на тэрыторыю сучаснай Палесціны. Ізраільскае царства. (Мораплаванне і гандаль ва Усходнім Міжземнамор'і.) З'яўленне алфавіта. Біблія.

**Тэма 5. Індыя і Кітай (5 г)**

**Індская цывілізацыя.** Прырода Старажытнай Індыі. Стварэнне дзяржавы ў даліне Інда. Гаспадарка старажытных індыйцаў. Грамадскі лад і культура.

**Прыход арыяў і культура ў Старажытнай Індыі.** З'яўленне арыяў у Старажытнай Індыі. Гаспадарчае жыццё. Грамадскі лад індыйцаў у канцы II — пачатку І тысячагоддзя да н. э. «Веды». (Санскрыт — мова ведыйскай культуры.) Літаратура. Рэлігіі Старажытнай Індыі.

**Узнікненне старажытнакітайскай цывілізацыі.** Першыя звесткі аб Старажытным Кітаі. Гаспадарчы ўздым у сярэдзіне І тысячагоддзя да н. э. Утварэнне адзінай кітайскай дзяржавы. Будаўніцтва Вялікай Кітайскай сцяны. (Грабніца імператара Цынь Шыхуана.)

**Кітай у эпоху імперыі Хань.** Аднаўленне адзінай дзяржавы. Захопніцкія войны імперыі Хань. Грамадства Старажытнага Кітая. Імператарская ўлада. Падзел насельніцтва Кітая на рангі. (Канфуцыянства і даасізм.)

**Культура Старажытнага Кітая.** Пісьмо. Гісторык Сыма Цянь. Навуковыя веды. Літаратура і мастацтва. Асаблівасці кітайскай архітэктуры.

Урок абагульнення. Роля народаў Старажытнага Усходу ў развіцці сусветнай культуры. Старажытны Усход і сучаснасць.

## Раздзел III

# ГІСТОРЫЯ СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ І СТАРАЖЫТНАГА РЫМА (28 г)

### Тэма 6. Старажытная Грэцыя (14 г)

**Найстаражытнейшая Грэцыя.** Прырода Грэцыі. Палацы на Крыце ў III—II тысячагоддзях да н. э. Мікены і Пілас. Міфы. Уяўленні аб багах. Гамер. «Іліяда» і «Адысея».

**Узнікненне дзяржаўнасці.** Удасканаленне прылад працы і жыццё першабытнай абшчыны. Свабодныя і залежныя людзі. Паняцце аб дзяржаве. (Майстры па жалезу. Гесіёд аб адносінах людзей у жалезны век. Грэчаскія пасяленні за межамі Балканскага паўвострава.)

**Асаблівасці развіцця Спарты і Афін.** Спартанцы і ілоты. Перыэкі. Дзяржаўны лад Спарты і Афін. Салон. (Спартанскае выхаванне. Афіны ў час Дракона. Пісістрат.)

**Войны грэкаў з персамі.** Паход персаў на Грэцыю. Марафонская бітва. Значэнне перамогі грэкаў. Варожасць паміж Спартай і Афінамі. (Паўстанне грэчаскіх гарадоў. Марафонскі бег.)

**У дэмакратычных Афінах.** Роля дэмасу ў Афінах. Перыкл. Афінская дэмакратыя. Прывілеі грамадзян. Дзяржава-поліс. Абмежаванасць афінскай дэмакратыі. (Фукідзід аб афінскай дэмакратыі.)

**Пелапанэская вайна.** Прыгнечанне сваіх саюзнікаў Афінамі. Ход вайны. Паражэнне Афін. (Сіцылійскі паход афінян.)

**Рабства.** Крыніцы рабства. Праца рабоў. Разарэнне сялян і рамеснікаў. (Платон аб адносінах паміж грамадзянамі і рабамі.)

**Узвышэнне Македоніі і ўсталяванне яе ўлады над грэкамі.** Барацьба грэчаскіх полісаў з Македоніяй. Заваяванні Аляксандра Македонскага. Дзяржава Аляксандра і яе распад.

**Рэлігія грэкаў у VI—V стст. да н. э.** Апякунства багоў. Багі-алімпійцы. Рэлігійныя святы. Панафінеі і Дыянісіі. Грэчаскі храм. (Міфы аб Праметэі і Геракле. Песня афінскіх ганчароў. Статуя Зеўса ў Алімпіі.)

**Школа і навуковыя веды.** Пісьменнасць. Школьнае навучанне. Навуковыя веды. Філасофія і вольнадумства. (Дэмакрыт. Платон. Сакрат. Архімед. Сакрат аб чалавеку і «дэмоніі». Фукідзід аб дзяржаве.)

**Грамадскія відовішчы.** Тэатр. Тэатральныя спаборніцтвы. Тэатр — выхаваўца грамадзян. Алімпійскія гульні. (Эсхіл. Сафокл. Эўрыпід. Хто ўстанавіў Алімпійскія гульні. Піфійскія гульні.)

**Мастацтва.** Архітэктура. Жывапіс. Скульптура. Асноўныя помнікі архітэктуры і скульптуры. (Храм Арцеміды Эфескай. Малюнкі на гліняных вазах. Статуя Геліяса.)

Урок абагульнення. Роля грэкаў у развіцці сусветнай гісторыі і культуры. Асаблівасці развіцця культуры Грэцыі.

**Тэма 7. Старажытны Рым (14 г)**

**Пачатак рымскай гісторыі.** Геаграфічнае палажэнне Апенінскага паўвострава. Насельніцтва. Паходжанне Рыма. (Легенда аб заснаванні Рыма.) Сведчанні навукі аб паходжанні Рыма.

**Царскі перыяд у гісторыі Рыма.** Ад першабытнай абшчыны да суседскай. Патрыцыі і плебеі. Патрыярхальнае рабства. Органы ўлады: народны сход, сенат, цар. Падзенне царскай улады.

**Быць грамадзянінам Рэспублікі.** Устанаўленне Рэспублікі ў Рыме. Грамадзяне Рэспублікі. Барацьба плебеяў з патрыцыямі. Народныя трыбуны. (Ганаровая служба ў органах улады і арміі. Роля арміі ў жыцці рымскага грамадства.)

**Рымляне — гаспадары Італіі і ўладары Міжземнамор'я.** Заваяванне Рымам Італіі. Нашэсце галаў на Рым. Вайна з Пірам. Войны Рыма з Карфагенам. (Пунічныя войны. Паход Ганібала на Рым. Вынікі Пунічных войнаў.)

**Разарэнне сялян Італіі і іх барацьба за зямлю.** Тыберый Гракх — заступнік абеззямеляных сялян. Гай Гракх і яго барацьба за перадзел зямлі. Вынікі зямельных рэформаў Гракхаў і іх значэнне.

**Рабаўладальніцтва ў Рыме і паўстанне Спартака.** Крыніцы рабства. Адносіны да рабоў. Паўстанне рабоў і беднякоў пад кіраўніцтвам Спартака. Гістарычнае значэнне паўстання.

**Рым — уладар свету.** Узрастанне ролі арміі. Грамадзянскія войны. Падзенне Рэспублікі. Дыктатура

Цэзара. Праўленне Актавіяна Аўгуста. (Імперыя на трох кантынентах.)

**Усе дарогі вядуць у Рым.** Наследнікі Аўгуста. Рым — сталіца імперыі. Паўсядзённае жыццё гараджан. (Рымскія лазні.)

**Мастацтва Старажытнага Рыма.** Рымляне — вучні грэкаў. Рымская рэлігія. Мастацкая літаратура і яе значэнне. Паэма Вергілія «Энеіда». Асноўныя помнікі архітэктуры. Скульптура і яе своеасаблівы характар.

**Узнікненне хрысціянства.** Прычыны ўзнікнення новай рэлігіі — хрысціянства. Ісус Хрыстос і яго вучэнне. Хрысціянскія запаведзі. Арганізацыя хрысціянскай царквы. Хрысціянства — дзяржаўная рэлігія імперыі. (Сведчанні пісьмовых крыніц аб Ісусе Хрысце.)

**Грамадскія відовішчы рымлян.** Арганізацыя грамадскіх відовішчаў. Лозунг «хлеба і відовішчаў!». Гладзіятарскія баі. Тэатр, цырк, іпадром.

**Аслабленне і падзенне Заходняй Рымскай імперыі.** Крызіс рымскага грамадства. Паўстанне ў правінцыях і набегі варвараў. (Нетрываласць імператарскай улады.) Раздзяленне імперыі. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі.

Урок абагульнення. Сусветна-гістарычнае значэнне культуры Старажытнага Рыма. Выкарыстанне здабыткаў матэрыяльнай і духоўнай культуры старажытных рымлян еўрапейскімі народамі пазнейшых эпох. Дасягненні рымлян у сучасным жыцці народаў свету.

## Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Геаграфічнае становішча і характэрныя асаблівасці развіцця краін старажытнага свету. Перыядызацыя гісторыі Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма.

Асноўныя тыпы рабаўладальніцкіх дзяржаў.

Міфы народаў як гістарычная крыніца вывучэння старажытнай гісторыі. Рэлігійныя вераванні народаў Усходу і антычных народаў. Хрысціянства і яго значэнне.

Найбольш вядомыя вучоныя, гістарычныя дзеячы і іхны ўклад у сусветную культуру.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ

## 17 гадзін
## (у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час)

**Уводзіны (1 г)**

Змест і значэнне старажытнай айчыннай гісторыі. Яе перыядызацыя і важнейшыя падзеі. Старажытная гісторыя Беларусі як частка сусветнай гісторыі.

Структура падручніка гісторыі Беларусі для 5 класа. Як працаваць з ім.

## Раздзел I

## КАМЕННЫ ВЕК У БЕЛАРУСІ. РАДАВАЯ АБШЧЫНА (100—5 ТЫСЯЧ ГАДОЎ НАЗАД) (6 г)

**Тэма 1. Найстаражытнейшыя жыхары нашай краіны (100—12 тысяч гадоў назад) (2 г)**

**Апошняя ледавіковая эпоха.** Прыродныя ўмовы ў час апошняга зледзянення (90 тысяч гадоў назад). Пранікненне першых людзей у Верхняе Падняпроўе 100—35 тысяч гадоў назад. Прылады працы «чалавека ўмелага», знойдзеныя ў Беларусі.

**Першыя стаянкі.** З'яўленне чалавека сучаснага знешняга выгляду. Першыя пасялішчы «чалавека разумнага» на Беларусі. (Юравічы, Бердыж.) Перарыў у засяленні тэрыторыі Беларусі 22—14 тысяч гадоў назад. Асаблівасці побыту людзей у канцы ледавіковага перыяду.

**Заняткі старажытнейшых жыхароў.** Віды гаспадарчай дзейнасці. Спосабы палявання. Раздзяленне працы па ўзросту і полу.

**Тэма 2. Чалавек у пасляледавіковы перыяд (12—5 тысяч гадоў назад) (3 г)**

**Засяленне тэрыторыі Беларусі.** З'яўленне людзей на новых тэрыторыях. Вынаходніцтвы ў пасляледавіковы перыяд (лук і стрэлы, каменная сякера, зернедрабілка і інш.). Стаянкі апошняга перыяду каменнага веку. З'яўленне глінянага посуду.

**Спажывецкая гаспадарка. Промыслы.** Спажыванне

чалавекам дароў прыроды. Павышэнне ролі рыбалоўства ў апошні перыяд каменнага веку. Бортніцтва. Здабыванне крэмня ў шахтах на рацэ Рось.

**Супольнасці людзей каменнага веку.** Узнікненне радавой абшчыны. Пачатак аб'яднання родаў у плямёны. Утварэнне групаў плямёнаў (днепра-данецкая, верхнедняпроўская, нёманская).

Урок абагульнення. Умовы жыцця і працы старажытнейшых людзей на тэрыторыі Беларусі. Змяненні ў іх занятках і грамадскім жыцці ў пасляледавіковую эпоху. Спажывецкі тып гаспадаркі.

## Раздзел II

## НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў БРОНЗАВЫМ І ЖАЛЕЗНЫМ ВЯКАХ. СУСЕДСКА-РАДАВАЯ АБШЧЫНА (4 ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ НАЗАД — V ст. н. э.) (10 г)

### Тэма 3. Ад спажывецкай гаспадаркі да вытворчай (4 г)

**Пераход да вытворчай гаспадаркі.** Прыручэнне дзікіх жывёл. Узнікненне земляробства. З'яўленне ворыўнага земляробства. Прадзіва і ткацтва. Вытворчая гаспадарка.

**Пачатак выкарыстання металаў.** Насельніцтва Беларусі ў бронзавым веку. Выкарыстанне медных і бронзавых прылад працы побач з каменнымі вырабамі. Свідравальны станок. Спосабы здабычы і апрацоўкі жалеза. (Племянныя групы жыхароў ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі. Культуры: мілаградская, зарубінецкая, штрыхаванай керамікі, днепрадзвінская.)

**Ад радавой да суседскай абшчыны.** Узрастанне ролі мужчынскай працы. Распад радавой абшчыны і станаўленне суседска-радавой абшчыны. Узнікненне маёмаснай няроўнасці людзей. Пачатак абмену паміж плямёнамі.

Урок абагульнення. Пераход да вытворчай гаспадаркі. Роля жалезных прылад працы. З'яўленне суседска-радавой абшчыны.

**Тэма 4. Духоўная культура (4 г)**

**Мова старажытных продкаў славян.** Роднасныя мовы. Індаеўрапейцы. Арыі. Балты і славяне. Прарадзіма славян. Іх рассяленне ў Еўропе.

**Народныя вераванні і святы.** Пакланенне з'явам прыроды. Народныя абрады і святкаванні земляробаў. Абрадавыя песні.

**Бытавыя звычаі і абрады.** Шлюбна-сямейныя адносіны. Клопат аб дзецях. Вясельны абрад. Пахавальныя абрады ў бронзавым і раннім жалезным вяках.

**Мастацтва.** Старажытная скульптура. Вытокі арнаменту. Старажытнейшыя арнаменты на гліняным посудзе. З'яўленне і ўдасканаленне ўпрыгажэнняў. Музычныя інструменты. Міфалогія.

**Выніковае абагульненне**

Вызначэнне і датыроўка асноўных перыядаў у старажытнай гісторыі Беларусі. Спажывецкі і вытворчы віды гаспадаркі. Вызначэнне на «стужцы часу» працэсу ўтварэння радавой і суседска-радавой абшчын. Творы першабытнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі. Сінхранічнае параўнанне гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

## Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Прадмет і храналогія гісторыі Беларусі старажытных часоў. Гістарычныя крыніцы: археалагічныя, міфалагічныя, тапанімічныя, этнаграфічныя.

Першыя спробы пранікнення «чалавека ўмелага» (неандэртальца) на тэрыторыі Беларусі ва ўмовах зледзянення яе паверхні.

З'яўленне «чалавека разумнага» (краманьёнца) на тэрыторыі Беларусі.

Паступовае ўдасканаленне прылад працы. Спажывецкі і вытворчы віды гіспадаркі старажытных людзей на беларускіх землях.

Характэрныя рысы развіцця радавой абшчыны (у каменным веку), суседска-радавой абшчыны (у бронзавым і раннім жалезным вяках).

Змяненні ў побыце людзей, звычаях і абрадах на Беларусі ў каменным, бронзавым і раннім жалезным вяках.

## Асноўныя ўменні вучняў

**Прымяняць лічэнне гадоў і стагоддзяў (да нашай эры і нашай эры); суадносіць вякі з тысячагоддзямі; вызначаць працягласць і сінхроннасць надзей;**

**паказваць на гістарычнай карце аб'екты, чытаць простыя карты і схемы;**

рабіць нескладаныя вывады, элементарна аналізаваць і абагульняць гістарычныя факты;

выдзяляць галоўнае ў тэкстах падручніка, састаўляць просты план параграфа, выкарыстоўваць дакументы і ілюстрацыі падручніка;

пераказваць змест тэкста падручніка, дакумента;

параўнальна апісваць прыродныя ўмовы, прылады працы, помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры;

даваць на аснове падручніка і дакументаў характарыстыку гістарычных дзеячаў;

правільна прымяняць і тлумачыць гістарычныя тэрміны і крылатыя выразы;

даваць вусна водгук на адказы другіх вучняў, выказваць свае меркаванні;

выяўляць свае адносіны да мастацкіх твораў.

# 6 КЛАС

# ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ

## 51 гадзіна
## (у тым ліку 5 гадзін — рэзервовы час)

**Уводзіны (1 г)**

Сярэднявечча ў гісторыі чалавецтва. Тэрмін «сярэднявечча», яго сэнс. Храналагічныя рамкі і перыядызацыя сярэдніх вякоў. Асноўныя крыніцы па гісторыі сярэднявечча.

## Раздзел I
## РАННЯЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА (V—IX стст.) (12 г)

### Тэма 1. Заходняя Еўропа (3 г)

**Заходняя Еўропа ў V—IX стст.** Старажытныя германцы, іх асноўныя гаспадарчыя занядкі, грамадскі лад. Варварскія дзяржавы. Каралеўская ўлада. (Германскі і рымскі элементы ў грамадскім ладзе, гаспадарцы, праве, духоўным жыцці варварскіх каралеўстваў.)

**Дзяржава франкаў.** Хлодвіг — кароль франкаў. Прыняцце франкамі хрысціянства. Імперыя Карла Вялікага. Росквіт дзяржавы франкаў. (Карл Вялікі як дзяржаўны дзеяч.) Змены ў аграрных адносінах. Каралінгскае адраджэнне.

**Заходняе хрысціянства ў V—IX стст.** Распаўсюджванне хрысціянства ў Заходняй Еўропе. Рымска-каталіцкая царква, папства. Усталяванне вяршынства рымскіх пап у заходнім хрысціянстве. Стварэнне папскай дзяржавы. (Роля царквы і манаства ў духоўным і гаспадарчым жыцці раннесярэдневяковай Заходняй Еўропы.)

### Тэма 2. Візантыйская імперыя (2 г)

**Узнікненне Візантыйскай імперыі і яе росквіт.** Асаблівасці развіцця Візантыі. Дзяржаўны лад. Царква і манаства. Росквіт Візантыі пры праўленні Юсцініяна.

(Знешняя палітыка. Заканадаўства.) Візантыйская вёска і горад у VII—IX стст.

**Культура Візантыі.** Развіццё асветы. (Візантыйскія школы. Навуковыя веды, адкрыцці, вынаходніцтвы. Візантыйскія гісторыкі, географы. Леў Матэматык.) Візантыйская архітэктура. Царкоўнае дойлідства. Храм Святой Сафіі ў Канстанцінопалі. Жывапіс. Візантыйскі іканапіс.

### Тэма 3. Славяне (2г)

**Славяне ў V—IX стст.** Рассяленне славян. Гаспадарчыя заняткі славян, іх паселішчы. (Грамадскі лад славян. Рэлігійныя ўяўленні.) Славяне і Візантыя.

Дзяржавы заходніх славян. Асветніцкая і царкоўная дзейнасць Кірыла і Мяфодзія, стварэнне славянскай пісьменнасці. Славяне на Балканскім паўвостраве. Стварэнне балгарскай дзяржавы. Прыняцце хрысціянства.

**Усходнія славяне.** Усходнеславянскія плямёны і іх рассяленне. Характэрныя рысы духоўнай і матэрыяльнай культуры. Рэлігійныя вераванні ўсходніх славян.

Першапачатковыя дзяржаўныя ўтварэнні.

### Тэма 4. Краіны Усходу (4 г)

**Кітай у раннім сярэднявеччы.** Тэрыторыя сярэдневяковага Кітая. Дзяржаўны і грамадскі лад. Кітайскія гарады. (Імператар і дзяржаўны апарат.) Сацыяльная структура. Рэлігія і культура раннесярэдневяковага Кітая.

**Узнікненне ісламу і аб'яднанне арабаў.** Прыродныя ўмовы і насельніцтва Аравійскага паўвострава. Арабы напярэдадні аб'яднання. Мухамед і ўзнікненне ісламу. Аб'яднанне арабаў. (Каран — свяшчэнная кніга мусульман. Асноўныя палажэнні і каштоўнасці ісламу.)

**Арабскі халіфат.** Заваяванні арабаў. Унутраны лад Арабскага халіфата. Гаспадарка. Распад халіфата.

Араба-ісламская культура. Літаратура. Навуковыя дасягненні. Архітэктура. (Роля сярэдневяковай араба-ісламскай культуры ў жыцці народаў халіфата і ў гісторыі ўсяго чалавецтва.)

**Індыя ў раннім сярэднявеччы.** Насельніцтва Індыі, яго асноўныя заняткі. Асаблівасці грамадскага ладу. Касты. Індыйскія гарады. Рэлігіі раннесярэдневяко-

вай Індыі. Навуковыя дасягненні індыйцаў. Архітэктура, тэатр, мастацтва.

Урок абагульнення (1 г). Асноўныя краіны Усходу ў раннім сярэднявеччы. Агульнае і адметнае ў сацыяльным, эканамічным, духоўным жыцці ўсходніх краін. Нераўнамернасць гістарычнага развіцця.

## Раздзел II

## ВЫСОКАЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА (X—XIII стст. (22 г)

### Тэма 5. Еўропа (15 г)

**Заходняя Еўропа ў X—XIII стст.** Эканамічнае развіццё. Натуральная гаспадарка. Феадальная залежнасць сялян. Феадальная іерархія, сеньёры і васалы. Феадальная раздробленасць.

**Заходнееўрапейскі сярэдневяковы горад.** Аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі. Узнікненне гарадоў. Цэхі і гільдыі. (Узнікненне банкаў.) Барацьба гараджан за самакіраванне. (Органы гарадскога самакіравання. Таварна-грашовая гаспадарка, яе асноўныя рысы).

**Быт насельніцтва Заходняй Еўропы.** Паўсядзённае жыццё сялян і жыхароў горада. Быт феадалаў. Рыцарскія турніры.

**Заходнееўрапейская культура ў X—XIII стст.** Адукацыя. Школы і універсітэты. Кнігі. Навуковыя веды. Архітэктура (раманскі і гатычны стылі). Літаратура, яе асноўныя жанры. Рыцарская культура, гарадская культура.

**Краіны Заходняй Еўропы ў X—XIII стст.** Падзел Франкскай дзяржавы. Францыя ў X—XIII стст. Першыя Капетынгі і палітычная раздробленасць Францыі. (Цэнтралізацыя даменаў.) Аб'яднанне Францыі.

Германія ў X—XIII стст. Узнікненне адзінай дзяржавы. (Сістэма тэрытарыяльных княстваў.) Стварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі.

Палітычная раздробленасць Італіі. Гарады-дзяржавы. Папская вобласць.

Англія ў X—XIII стст. Англасаксонская Брытанія. Дацкае нашэсце. Нармандскае заваяванне. Складванне адзінай англійскай народнасці. Захоп Ірландыі і Уэльса. Войны з Шатландыяй. Узнікненне парламента.

**Краіны Паўночнай і Паўднёва-Заходняй Еўропы ў X—XIII стст.** Народы Скандынавіі. Паходы вікінгаў на захад. Краіны Паўночнай Еўропы.

**Краіны Пірэнейскага паўвострава.** Рэканкіста, яе ход і вынікі.

**Заходнеславянскія дзяржавы.** Стварэнне Польскай дзяржавы. Мешка І. Прыняцце хрысціянства. (Баляслаў І Храбры. Феадальная раздробленасць.) Тэўтонскі ордэн і Польшча.

Чэшскае каралеўства. (Феадальныя адносіны ў чэшскіх землях.) Чэхія і Свяшчэнная Рымская імперыя.

**Каталіцкая царква ў X—XIII стст.** Царкоўны раскол 1054 года. «Свет лацінскі» і «свет праваслаўны». Царква і свецкая ўлада. Крыжовыя паходы, іх прычыны і вынікі. (Асноўныя манаскія ордэны.)

**Візантыя ў высокім сярэднявеччы.** Аграрныя адносіны. Візантыйскія гарады. (Формы арганізацыі гандлю і рамяства ў гарадах.) Імператарская ўлада і дзяржаўны апарат. (Візантыйская царква, яе арганізацыя, залежнасць ад дзяржаўнай улады.)

Знешняя палітыка Візантыі. IV крыжовы паход і яго вынікі для Візантыі. Захоп Канстанцінопаля туркамі-асманамі.

**Паўднёвыя славяне ў X—XIV стст.** Першае Балгарскае царства. Адносіны з Візантыяй. (Балгарскія землі пад візантыйскім уладарніцтвам.) Другое Балгарскае царства.

Утварэнне Сербскай дзяржавы. (Стэфан Душан. Распад Сербскай дзяржавы.) Бітва на Косавым полі (1389). Захоп Сербіі туркамі-асманамі.

**Старажытная (Кіеўская) Русь.** Праўленні першых Рурыкавічаў. Знешняя палітыка Алега, Ігара і Святаслава. Хрысціянізацыя Русі. Кіеўская Русь пры Яраславе Мудрым. «Руская праўда».

**Дзяржавы-княжанні Усходняй Еўропы.** Барацьба з варожай навалай. Напярэдадні ўдзельшчыны. Уладзімір Манамах. Утварэнне самастойных дзяржаў-княжанняў. Усобіцы з-за Кіеўскага княжання. Галіцкая і Валынская землі і іх аб'яднанне. Першыя «самаўладцы» Паўночна-Усходняй Русі. Палітычны лад і гаспадарчае жыццё ў Ноўгарадскай арыстакратычнай рэспубліцы.

Нашэсце мангола-татараў на Русь. Барацьба з крыжакамі. Князь Аляксандр Яраславіч (Неўскі).

**Культура Старажытнай (Кіеўскай) Русі.** Мясцовыя традыцыі, перайманні і ўзоры ў культуры народаў Усходняй Еўропы. Царква ў культурным жыцці Русі. Пісьменнасць на Русі. Берасцяныя граматы. Быліны. Літаратура. Летапісы. Архітэктура. Храмавае і абарончае дойлідства. Жывапіс.

### Тэма 6. Краіны Усходу ў высокім сярэднявеччы (4 г)

**Кітай.** Змены ў аграрных адносінах, усталяванне прыватнай уласнасці на зямлю. Вынаходніцтвы кітайцаў. Мангольскае нашэсце на Кітай. Культура, побыт і звычаі насельніцтва Кітая.

**Японія.** Утварэнне японскай дзяржавы. Змены ў феадальных адносінах. Самураі — ваенна-службовае саслоўе. Гаспадарчае жыццё. Феадальная раздробленасць. Барацьба з мангольскім нашэсцем.

Рэлігіі і культура сярэдневяковай Японіі.

**Іран і Сярэдняя Азія ў X—XIII стст.** Іран і Сярэдняя Азія пасля распаду Арабскага халіфата. Сельджукскае заваяванне. Мангольскае нашэсце. Культура Ірана і Сярэдняй Азіі. Аль-Біруні, Ібн Сіна, Рудакі, Фірдаусі, Амар Хаям.

**Індыя ў X—XIII стст.** Дэлійскі султанат, тэрыторыя, этнічны склад. Дзяржаўны і грамадскі лад. Гаспадарчае жыццё. Культура. Уплыў ісламу і індуізму на індыйскую культуру.

### Тэма 7. Трапічная Афрыка і Амерыка (2 г)

**Трапічная Афрыка.** Гаспадарчыя заняткі і ўзровень культуры. Асаблівасці сацыяльных адносін. З'яўленне еўрапейцаў у Трапічнай Афрыцы. Гандаль рабамі, яго вынікі для Афрыкі.

**Амерыканскія цывілізацыі.** Асаблівасці іх сацыяльнага ладу. Цывілізацыі майя, ацтэкаў, інкаў. Гаспадарка, культура, рэлігія.

Урок абагульнення. Асноўныя рысы гістарычнага развіцця народаў Еўропы, Азіі, Афрыкі ў высокім сярэднявеччы.

## Раздзел III

## ПОЗНЯЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА (XIV—XV стст.) (11 г)

### Тэма 8. Еўропа (9 г)

**Заходняя Еўропа ў XIV—XV стст.** Сельская гаспадарка. Змены ў пазямельных адносінах. Саслоўна-прадстаўнічая манархія, яе асноўныя рысы, асаблівасці ў розных краінах.

**Італія ў XIV—XV стст.** Мануфактурная вытворчасць, яе асноўныя рысы. (Першыя мануфактуры ў Італіі.) Змены ў грамадскім ладзе італьянскіх гарадоў-дзяржаў. (Венецыя і Генуя, іх саперніцтва. Раздробленасць Паўночнай Італіі. Паўднёвая Італія.) Неапалітанскае каралеўства.

**Свяшчэнная Рымская імперыя ў познім сярэдневеччы.** Тэрыторыя, палітычная раздробленасць Свяшчэннай Рымскай імперыі. Кіраванне імперыяй. (Імператарская ўлада. Рэйхстаг, ландтагі.)

Чэхія ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі. Ян Гус. Гусіцкі рух. Табарыты. Значэнне гусіцкіх войнаў.

**Англія і Францыя ў XIV—XV стст.** Стогадовая вайна, яе прычыны, ход, вынікі. Жанна д'Арк. Сялянскія паўстанні XIV ст. Жакерыя. Паўстанне Уота Тайлера.

Англія ў XV ст. Вайна Пунсовай і Белай Ружы. Цэнтралізацыя краіны.

Францыя ў XV ст. Заканчэнне аб'яднання краіны. Узмацненне каралеўскай улады.

**Польшча ў XIV—XV стст.** Аб'яднанне Польшчы ў пачатку XIV ст. Казімір III Вялікі. Сеймы. Крэўская унія, яе вынікі для Польшчы. Войны з Тэўтонскім ордэнам. Грунвальдская бітва і яе значэнне.

Польская культура XIV—XV стст. Кракаўскі універсітэт. (Ян Длугаш.) Польскія гуманісты. Архітэктура.

**Каталіцкая царква ў XIV—XV стст.** Заняпад палітычнай магутнасці папства. (Папы ў авіньёнскім «палоне».) «Вялікі раскол», яго сутнасць. (Выступленні супраць папства.) Пачаткі нацыянальна-дзяржаўных цэркваў.

**Ранняе Адраджэнне.** Узнікненне і асаблівасці культуры Адраджэння. Гуманізм, яго асноўныя рысы.

Дзеячы Ранняга Адраджэння: Дантэ, Петрарка, Бакачыо.

Мастацтва Ранняга Адраджэння. Італьянскія мастакі. Скульптура Архітэктура.

Кнігадрукаванне ў Заходняй Еўропе. Іаган Гутэнберг. Значэнне яго вынаходніцтва.

**Барацьба за стварэнне адзінай Русі.** Жыццё пад ардынскім ігам. Палітыка ардынскіх ханаў. Вылучэнне Маскоўскага княства. Іван Каліта. Праваслаўная царква ў палітычным жыцці.

**Масква і Вялікае княства Літоўскае.** Лёс паўднёва-заходніх зямель Русі. Дзмітрый Іванавіч (Данскі). Кулікоўская бітва, яе вынікі. Іван III — стваральнік расійскай дзяржаўнасці і заснавальнік імперскай палітыкі.

**Культура народаў Усходняй Еўропы XIV—XV стст.** Матэрыяльнае і духоўнае жыццё людзей розных слаёў грамадства.

Назапашванне навуковых ведаў. Адукацыя. Літаратура. Архітэктура. Жывапіс. Андрэй Рублёў, Феафан Грэк.

### Тэма 9. Краіны Усходу ў XIV—XV стст. (1 г)

**Кітай.** Дзяржаўны лад, сацыяльныя адносіны. З'яўленне заходнееўрапейцаў у Кітаі.

**Японія ў познім сярэднявеччы.** «Смутны час». Аб'яднанне краіны. Самаізаляцыя Японіі.

**Іран і Сярэдняя Азія.** Вызваленне Ірана ад мангольскага іга. Паўстанне сарбердараў. Цімур і яго паходы.

**Асманская дзяржава.** Узнікненне Асманскай дзяржавы. Аб'яднанне туркаў і заваяванне Балканскага паўвострава. Палітычны лад. Сацыяльныя адносіны ў Асманскай дзяржаве.

Урок абагульнення. Асноўныя рысы развіцця краін свету ў познім сярэднявеччы.

### Агульнагістарычныя веды
### (паняцці, праблемы, ідэі)

Сэнс паняццяў «сярэднія вякі», «феадалізм». Перыядызацыя сярэдніх вякоў, асаблівасці яе для розных цывілізацый.

Асноўныя рысы эканамічнага, сацыяльнага, духоўнага жыцця цывілізацый сярэднявечча.

Аграрная вытворчасць, натуральная гаспадарка, таварна-грашовыя адносіны.

Сэнс тэрмінаў «феадальная залежнасць», «феадальная іерархія», «сюзерэнітэт», «васалітэт». Асноўныя формы дзяржаў сярэднявечча. Гарады як цэнтры эканамічнага жыцця, сацыяльныя адносіны ў сярэдневяковых гарадах.

Месца рэлігіі ў светапоглядзе чалавека, грамадскім жыцці. Хрысціянства як дамінуючая рэлігія ў Еўропе. «Свет каталіцкі» і «свет праваслаўны». Асноўныя рэлігіі краін Азіі.

Асноўныя дасягненні культуры сярэдневяковых краін. Уплыў рэлігій на развіццё культуры. Ранняе Адраджэнне ў Еўропе, гуманізм.

Агульнае і адметнае ў развіцці сярэдневяковых краін свету.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДНІЯ ВЯКІ

## 34 гадзіны (у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)

**Уводзіны (1 г)**

Асаблівасці зместу паняцця «сярэднявечча ў гісторыі Беларусі»

## Раздзел I

## БЕЛАРУСЬ У VI—IX стст. ШМАТУКЛАДНАЕ ГРАМАДСТВА (6 г)

### Тэма 1. Ад старажытных часоў да сярэднявечча (1 г)

**Перыядызацыя сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі.** Тры перыяды сярэдневяковай гісторыі. Роля геаграфічнага становішча беларускіх зямель у гістарычным лёсе краю.

**Асноўныя дасягненні ў вывучэнні сярэдневяковай гісторыі Беларусі.** Археалагічныя даследаванні. Музеі — сховішчы гістарычных скарбаў. Летапісы. Працы В. Ластоўскага, У. Ігнатоўскага і інш.

**Тэма 2. Балцкае і славянскае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі (4 г)**

**Балты і славяне.** Пачатак рассялення славян на тэрыторыі Беларусі. Сумеснае жыццё славян і балтаў. Славянізацыя балцкага насельніцтва. Вытокі беларускага этнаса.

**Усходнеславянскае насельніцтва Беларусі.** Аб'яднанні ўсходніх славян (крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы, часткова валыняне). Гаспадарчыя заняткі насельніцтва. (Пахавальны абрад.)

**Культура.** Язычніцтва ў балтаў і славян. Язычніцкія капішчы. Язычніцкія божышчы.

Урок абагульнення. Работа над паняццямі (гістарычны музей, каланізацыя, мнагабожжа і інш.). Работа з картай і датамі. Сістэматызацыя матэрыялу (пабудова лагічных ланцужкоў, састаўленне сінхранічнай табліцы «Франкі, славяне і балты» і інш.).

## Раздзел II
## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў X—XIII стст. УСТАЛЯВАННЕ ФЕАДАЛЬНЫХ АДНОСІН (15 г)

**Тэма 3. Гаспадарчае і грамадскае развіццё ў X—XIII стст. (3г)**

**Гаспадарчыя адносіны.** Даніна і палюддзе. З'яўленне феадальнага эканамічнага ўклада. Феадальны двор і сяло.

**Грамадскі лад.** Суседская (сельская) абшчына. Ад ваеннай дэмакратыі да дзяржавы. Прыкметы дзяржаўнай арганізацыі.

**Горад у X—XIII стст.** Узнікненне гарадоў. Іх выгляд, насельніцтва, рамесная вытворчасць і гандаль.

**Тэма 4. Полацкае і Тураўскае княствы (6 г)**

**Полацкая зямля-княства.** Полацк — цэнтр княства-дзяржавы. Полацкі князь Рагвалод. Князёўна Рагнеда. Князь Ізяслаў і аднаўленне княжацкай дынастыі.

**Узвышэнне Полацкай дзяржавы.** Саперніцтва Полацка з Ноўгарадам. Князь Усяслаў Брачыславіч. Бітва на Нямізе (1067). Найвышэйшы ўздым Полацкага княства ў XI ст.

**Барацьба за самастойнасць у XII ст.** Падзел Полацкай зямлі на ўдзельныя княствы. Часовае ўзвы-

шэнне Менскага княства. Паход кіеўскага князя Мсціслава на Полацкую зямлю (1127). Высылка полацкіх князёў у Візантыю і іх вяртанне на радзіму.

**Княжацка-вечавы лад у Полацкай зямлі.** Парадак княжання ў Полацку. Улада князя. Вайсковая арганізацыя. Дзейнасць веча.

**Тураўская зямля-княства.** Узнікненне Тураўскага княства. Адносіны Турава з Кіевам. Роля Пінска на беларускім Палессі. Адраджэнне тураўскай княскай дынастыі і самастойнасці Тураўскага княства ў 1158 г. Асаблівасці грамадска-палітычнага ладу (князь, пасаднік, тысяцкі).

**Берасцейская зямля.** Адзінства тэрыторыі. Прыкметы горада-дзяржавы ў Берасці. Археалагічныя адкрыцці на Берасцейскім гарадзішчы. Гарады Берасцейскай зямлі: Драгічын над Бугам, Камянец і інш.

### Тэма 5. Царква і культура (2 г)

**Распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях.** Прыняцце новай веры вярхамі тагачаснага грамадства. Царкоўная іерархія. Двухвер'е. Станоўчыя вынікі распаўсюджвання хрысціянства.

**Рэлігійна-асветніцкія дзеячы. Іх жыццё і дзейнасць.** Ефрасіння Полацкая. Кірыла Тураўскі. Кліменцій Смаляціч. Аўрамій Смаленскі.

**Культура ў X—XIII стст.** Мураванае дойлідства, фрэскі. Полацкая Сафія. Спаса-Ефрасіннеўская царква. Крыж Ефрасінні Полацкай. Пісьменнасць. Рукапісныя кнігі.

### Тэма 6. Утварэнне асновы Вялікага княства Літоўскага (4 г)

**Феадальная раздробненасць, яе прычыны і вынікі.** Прычыны раздробненасці. Раздробненасць Полацкай зямлі. Драбненне Тураўскай зямлі. Княствы ў Пасожжы. Княствы ў Панямонні.

**Крыжацкая і татарская навала.** Пранікненне нямецкіх рыцараў ва Усходнюю Прыбалтыку. Кукенойс і Герцыке — фарпосты Полацкай зямлі. Князь Вячка. Далейшае супрацьдзеянне Полацка захопнікам. Пагроза мангола-татарскага заняволення.

**Пачатак Вялікага княства.** Летапісныя звесткі пра Літву і князя Міндоўга. Прычыны аб'яднання беларускіх і літоўскіх зямель у адзіную дзяржаву. Панямонне — арэна змагання галіцка-валынскіх і літоўскіх

князёў. Міжусобная барацьба за вялікае княжанне пасля смерці Міндоўга.

Паўторна-абагульняльны ўрок

## Раздзел III

## БЕЛАРУСЬ У XIV—XV стст. РОСКВІТ ФЕАДАЛЬНЫХ АДНОСІН (12 г)

### Тэма 7. Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (6г)

**Умацаванне вялікакняскай улады.** Шляхі ўключэння Полацкай зямлі і іншых беларускіх зямель у склад Вялікага княства. Адзінаўладдзе пры Гедыміне. Славуты стараста Давыд Гарадзенскі. Прынятце агульнадзяржаўнага герба «Пагоня».

**Княжанне Альгерда. Крэўская вунія.** Альгерд і Кейстут. Крэўская вунія. Аб'яднанне з Польскім каралеўствам і яго вынікі.

**Княжанне Вітаўта.** Грамадзянская вайна. Востраўскае пагадненне Ягайлы з Вітаўтам (1392). Гарадзельская вунія (1413). Грамадзянская вайна 1432—1436 гадоў пасля смерці князя Вітаўта.

**Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага ў XIV—XV стст.** Абвастрэнне барацьбы з Тэўтонскім ордэнам. Узаемаадносіны з Маскоўскім княствам. Барацьба з Залатой Ардой. Перамога Альгерда над татарамі на Сініх водах (1363). Паражэнне Вітаўта на Ворскле (1399) і яго вынікі.

**Грунвальдская бітва.** Крыжацкая навала на літоўска-беларускіх землях. Падрыхтоўка да вайны з крыжакамі. Ход бітвы пад Грунвальдам. Вынікі і значэнне Грунвальдскай бітвы.

**Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага.** Вышэйшыя органы ўлады. Мясцовае кіраванне. Граматы Казіміра. Судзебнік Казіміра (1468).

### Тэма 8. Гаспадарчае жыццё ў XIV—XV стст. (2 г)

**Паны, баяры, сяляне.** Землеўладальнікі і землекарыстальнікі. Развіццё сельскай гаспадаркі. Саслоўі феадальнага грамадства (шляхта, мяшчане, сяляне і інш.).

**Стан гарадоў у XIV—XV стст.** Гарады і замкі. Насельніцтва гарадоў. Магдэбургскае права. Рамяство і гандаль.

Тэма 9. Культура Беларусі ў XIV—XV стст. (4 г)

**Беларускі народ-этнас.** Вытокі беларускай народнасці (народа). Этнічнае развіццё беларусаў у сярэднявеччы. Адметныя рысы беларусаў. «Белая Русь» і «ліцвіны-беларусы».

**Духоўная культура.** Дойлідства. Жывапіс і скульптура. Кніжная справа. Летапісанне. Перакладная літаратура. Царква і касцёл.

Паўторна-абагульняльны ўрок. Работа з картай. Параўнанне гістарычных з'яваў: «Гарады Беларусі і Заходняй Еўропы», «Селянін і рамеснік у сярэднія вякі» і інш. Класіфікацыя датаў. Сістэматызацыя матэрыялу.

Работа са «стужкай часу» і з гістарычнымі паняццямі. Гістарычныя каштоўнасці сярэднявечча. Складанне сінхранічнай табліцы.

## Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Прадмет і храналогія гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў. Гістарычныя крыніцы: пісьмовыя, археалагічныя.

Асноўныя рысы развіцця сярэдневяковага грамадства. Важнейшыя змены ў грамадстве.

Рассяленне славян сярод балтаў у Верхнім Падняпроўі, Падзвінні, Панямонні. Фарміраванне ўсходнеславянскіх супольнасцей крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў.

Полацкае княства — першая раннесярэдневяковая дзяржава на тэрыторыі Беларусі.

Княствы — Тураўскае, Гародзенскае, Менскае і інш.— як развіццё дзяржаўнасці на Беларусі ў X—XII стст.

Роля беларусіх зямель ва ўтварэнні Вялікага княства Літоўскага.

Значэнне Вялікага княства Літоўскага ў гісторыі Еўропы ў XIII—XV стст.

## Асноўныя ўменні вучняў

**Вызначаць храналогію падзей, сінхранізаваць асноўныя падзеі з развіцця розных цывілізацый, асэнсоўваць нераўнамернасць гістарычнага развіцця цывілізацый сярэднявечча;**

працаваць з гістарычнай картай; аналізаваць, параўноўваць і абагульняць асноўныя гістарычныя факты;

вывучаць нескладаныя гістарычныя першакрыніцы, здабываць з іх неабходныя веды;

пераказваць тэкст падручніка, выкарыстоўваючы матэрыял гістарычных першакрыніц і карт;

складаць расказ па тэксту падручніка і другіх крыніц ведаў на аснове простага плана;

даваць характарыстыкі асобных гістарычных дзеячаў (з улікам агульнай характарыстыкі адпаведнай цывілізацыі), ацэньваць іх дзейнасць з пункту гледжання агульначалавечых каштоўнасцей;

характарызаваць асноўныя дасягненні культуры сярэднявечча, ацэньваць іх эстэтычную і духоўную каштоўнасць;

даваць характарыстыкі асноўных ідэй і каштоўнасцей, найбольш значных рэлігійных сістэм сярэднявечча;

фармуляваць свой пункт гледжання пры абмеркаванні найбольш значных пытанняў урока.

# 7 КЛАС

# СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НОВАГА ЧАСУ (XVI—XVIII стст.)

## 51 гадзіна (у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)

**Уводзіны (1 г)**

Паняцце «новы час». Гістарычны змест новага часу. Праблема перыядызацыі. Месца і значэнне новага часу ў гісторыі чалавецтва. Паняцце «цывілізацыя». Характэрныя рысы і прыкметы еўрапейскіх і ўсходніх цывілізацый у новы час.

### Раздзел I

### ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА (21 г)

**Тэма 1. Ад сярэднявечча да новага часу (5 г)**

**Вялікія геаграфічныя адкрыцці і іх значэнне для народаў Еўропы, Азіі і Афрыкі.** Адкрыццё Амерыкі і марскога шляху з Еўропы ў Індыю. Захоп і абрабаванне адкрытых зямель. Пачатак эпохі каланіялізму. (Набыццё гісторыяй сусветнага характару.)

**Адраджэнне і гуманізм.** Адраджэнне — пераходны перыяд ад сярэдневяковай культуры да культуры новага часу. Адметныя рысы Адраджэння. Яго антыклерыкальны характар, гуманістычны светапогляд. Вялікія дзеячы Адраджэння і гуманізму.

**Рэфармацыя і рэлігійныя войны.** Антыфеадальны характар Рэфармацыі. Барацьба супраць каталіцкай царквы. Ідэалогія і асноўныя напрамкі Рэфармацыі. Сялянская вайна ў Германіі. Рэлігійныя войны. Вынікі рэфармацыйнага руху.

**Рэвалюцыя ў Нідэрландах.** Нідэрланды ў складзе імперыі Карла V. Дваранская апазіцыя. Іканаборчае паўстанне 1566 г. Усеагульнае паўстанне ў паўночных і паўднёвых правінцыях, Утрэхцкая вунія 1579 г. Вызваленне ад іспанскага панавання і ўтварэнне буржуазнай Рэспублікі Злучаных Правінцый.

## **Тэма 2. Заходняя Еўропа ў XVII—XVIII стст. (7 г)**

**Нараджэнне сучаснай навукі.** Гістарычны прарыў у навуцы XVI ст. Усплеск навуковага мыслення. XVII стагоддзе — стагоддзе геніяў. Развіццё тэхнікі і прыродазнаўства. Тэхнічны прагрэс. Матэматыка. Астраномія. (Фр. Бэкан, Г. Галілей, Р. Дэкарт, І. Ньютан, Дж. Лок, Б. Спіноза.)

**Эпоха Асветы.** Змест і сацыяльна-палітычны напрамак Асветы. Яе антыклерыкальны характар. Тэорыі «прыроджанага права» і «грамадскага дагавору». Палітыка-дзяржаўныя канцэпцыі асветнікаў. Мастацкая культура Асветы, яе грамадскае гучанне.

**Эканамічны змест эпохі.** Узнікненне розных форм вытворчасці. Працэс нараджэння капіталізму. Асаблівасці «першапачатковага накаплення». Каланіяльная экспанія. Яе роля ў развіцці капіталізму.

**Дзяржава ў XVII—XVIII стст.** Дзяржава і грамадства. Умацаванне ролі дзяржавы. Росквіт абсалютызму. Фінансавая і падатковая палітыка. (Дзяржаўныя падзыкі.)

**Каталіцкая царква.** Рост апазіцыі супраць каталіцкай царквы. Падзенне міжнароднага значэння папства. Езуіты. Інквізіцыя. Ведаўскія працэсы. Свабодамыснасць.

**Дзяржаўна-палітычнае развіццё Еўропы.** Адносіны паміж краінамі Заходняй Еўропы ў XVII ст. Трыццацігадовая вайна. Вайна за іспанскую спадчыну. Паўночная вайна. (Узвышэнне Расіі, Прусіі і Аўстрыі.) Пераход гегемоніі ў Заходняй Еўропе ад Францыі да Англіі.

Урок абагульнення. Асноўныя тэндэнцыі развіцця Заходняй Еўропы ў XVII—XVIII стст.

## **Тэма 3. Еўрапейскія буржуазныя рэвалюцыі XVII—XVIII стст. (5 г)**

**Англійская буржуазная рэвалюцыя XVII ст.** Англія напярэдадні рэвалюцыі. Эканамічнае становішча, канфлікт паміж абсалютызмам і парламенцкай апазіцыяй. Ідэалагічныя і палітычныя перадумовы рэвалюцыі. (Пурытанізм.)

Пачатковы этап рэвалюцыі. Доўгі парламент і яго барацьба з абсалютызмам. Першая грамадзянская вайна. (Барацьба за паглыбленне рэвалюцыі. Першая чыстка парламента.) Дыктатура Кромвеля. Другая грамадзянская вайна і пакаранне смерцю караля. Абвяшчэнне рэспублікі. Парламенцкая манархія.

**Французская буржуазная рэвалюцыя канца XVIII ст.** Францыя напярэдадні рэвалюцыі. Крызіс феадальна-абсалютысцкага ладу. Унутраная палітыка манархіі пры Людовіку XVI. Рэвалюцыйная ідэалогія. Наспяванне сацыяльнага выбуху.

**Пачатак рэвалюцыі і звяржэнне манархіі.** Паўстанне ў Парыжы і ўзяцце Бастыліі 14 ліпеня 1789 года. Буйная буржуазія ва ўладзе. «Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна». (Рэвалюцыя і каталіцкая царква.) Канстытуцыя 1791 года. (Рэвалюцыйныя войны.) Звяржэнне манархіі і ўстанаўленне рэспублікі.

**Устанаўленне якабінскай дыктатуры.** Арганізацыя ўлады і яе мерапрыемствы. (Антыкаталіцкі рух.) Рабесп'ер. Якабінскі тэрор. Крызіс і падзенне якабінскай дыктатуры. Тэрмідарыянскі пераварот і яго вынікі. Ад тэрмідора да ваеннай дыктатуры Напалеона Банапарта.

**Французская рэвалюцыя і культура.** Палітыка рэвалюцыйнай Францыі ў галіне культуры. Літаратура і мастацтва. Побыт перыяду рэвалюцыі. Уплыў рэвалюцыі на еўрапейскую культуру.

**Пачатак прамысловай рэвалюцыі ў Англіі.** Паняцце «прамысловая рэвалюцыя», яго змест і сэнс. Дэмаграфічны ўздым у XVIII ст. Прагрэс у тэхніцы і металургіі. Вынаходніцтва і прымяненне новых машын. («Гандлёвая рэвалюцыя».) Англія — «майстэрня свету». Пачатак прамысловай рэвалюцыі ў Францыі і Германіі.

### Тэма 4. Літаратура і мастацтва (4 г)

**Літаратура XVI—XVII стст.** Узнікненне новай літаратуры пад уплывам Адраджэння. Творчасць М. Сервантэса, У. Шэкспіра, Ф. Рабле і Ш. Перо. Творы фальклору, народныя кнігі.

**Мастацкая літаратура Асветы.** Асветніцкі навучальны, выхаваўчы раман. Кнігі Д. Дэфо, Дж. Свіфта, Р. Распэ. Геніяльныя камедыі П. Бамаршэ. Нямецкі паэт і драматург Ф. Шылер.

**Мастацтва італьянскага Адраджэння.** Леанарда да Вінчы. Мікеланджэла Буанароці. Рафаэль Санці. Мастацтва нідэрландскага і нямецкага Адраджэння (Пітэр Брейгель Старэйшы, А. Дзюрэр).

Асаблівасці еўрапейскага мастацтва XVI—XVIII стст. Архітэктура барока. Мастацтва М. Кара-

ваджа, Д. Веласкеса, П. Рубенса і Х. Рэмбранта. Вялікія кампазітары І. Бах і В. А. Моцарт.

Урок абагульнення. Вынікі развіцця краін Заходняй Еўропы ў XVI—XVIII стст.

## Раздзел II

## АМЕРЫКА (5 г)

### Уводзіны

Асаблівасці духоўнага і матэрыяльнага жыцця. Еўрапейская каланізацыя. Этнічнае змяшэнне. Рэшткі дакалумбавых цывілізацый.

### Тэма 5. Паўночная Амерыка (3 г)

**Паўночнаамерыканскія калоніі Англіі.** Сацыяльна-эканамічнае развіццё і палітычны лад. Знішчальныя войны супраць індзейцаў. Рабства неграў, яго характар. Дэмакратычны рух у каланіяльны перыяд.

**Амерыканская асвета.** Т. Джэферсан. Т. Пэйн. Іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё.

**Вайна за незалежнасць і ўтварэнне Злучаных Штатаў Амерыкі.** Узмацненне супярэчнасцей паміж калоніямі і метраполіяй. (Патрыёты і лаялісты.) Пачатак узброенай барацьбы. Дж. Вашынгтон. «Дэкларацыя незалежнасці». Утварэнне ЗША. Канстытуцыя 1787 года. Асноўныя вынікі і гістарычнае значэнне Вайны за незалежнасць.

**Навука і культура.** Пачатковая адукацыя. Каледжы і ўніверсітэты. Навука і тэхніка. Зараджэнне амерыканскай літаратуры і мастацтва.

### Тэма 6. Ля вытокаў лацінаамерыканскай цывілізацыі (2 г)

**Лацінаамерыканцы:** хто яны і як з'явіліся на кантыненце. Індзейцы, еўрапейцы і афрыканцы.

**Лацінская Амерыка ў XVII—XVIII стст.** Партугальская і іспанская каланізацыя Лацінскай Амерыкі. Эканамічнае жыццё. Становішча карэннага насельніцтва і неграў. Узмацненне крэольскай апазіцыі. (Уплыў Французскай буржуазнай рэвалюцыі на Лацінскую Амерыку.) Рэвалюцыя неграў-рабоў на Гаіці.

**Лацінаамерыканская культура ў каланіяльны перыяд.** Распаўсюджванне еўрапейскай культуры. Роля каталіцкай царквы. Барталамэ дэ Лас Касас. Будаў-

ніцтва гарадоў. (Хрысціянізацыя мастацтва.) Музычнае мастацтва і яго асаблівасці.

## Раздзел III

## РАСІЯ І СЛАВЯНСКІЯ КРАІНЫ (13 г)

### Тэма 7. Расія (10 г)

**Расійская дзяржава ў XV ст.** Завяршэнне аб'яднання рускіх зямель. Значэнне стварэння расійскай дзяржавы. Барацьба за ўладу. Рэформы 50-х гадоў XVI ст. Ваенныя паходы. Лівонская вайна. Іван Грозны, апрычніна.

**«Смутны час» і першая грамадзянская вайна ў Расіі.** Перадумовы «Смуты». Гадуноў і яго праўленне. «Царэвіч Дзмітрый». Грамадзянская вайна. Ілжэдзмітрый. Інтэрвенцыя. Апалчэнні. (Вызваленне Масквы.) Пачатак праўлення Раманавых. Скančэнне інтэрвенцыі.

**Эканамічнае развіццё пасля «Смуты».** Узмацненне прыгонніцтва. Новыя рысы ў эканоміцы. Гарады. Рамёствы. Мануфактура. Гандаль. Купецтва. Каланізацыйныя працэсы. Тэрыторыя і насельніцтва.

**Палітычнае развіццё ў XVII стагоддзі.** Аляксей Міхайлавіч. Баярская дума. Земскія саборы. Прыказы. Станаўленне абсалютызму. Процiборствы народа і дзяржавы. Гарадскія паўстанні. Сялянская вайна. С. Разін.

**Эпоха Пятра Вялікага.** Пачатак праўлення. Паўночная вайна. (Паражэнне пад Нарвай.) Ваенна-эканамічныя пераўтварэнні. Працяг вайны. Палтаўская бітва. Перамогі рускага флоту. Вынікі Паўночнай вайны. Рэформы ў кіраванні дзяржавай. Царкоўная рэформа. («Табель аб рангах».) Устанаўленне абсалютызму. Утварэнне Расійскай імперыі. Асоба Пятра I.

**Дварцовыя перавароты.** Кіраванне Кацярыны I і Пятра II. «Вярхоўнікі». Ганна Іванаўна. «Біронаўшчына». (Лізавета Пятроўна. Пётр III). Удзел Расіі ў Сямігадовай вайне. Пашырэнне прывілеяў дваран.

**Эпоха Кацярыны II.** Саслоўная палітыка. Узмацненне прыгонніцтва. Сялянская вайна (1773—1775). Пугачоў. (Асноўныя задачы знешняй палітыкі ў другой палове XVIII ст.) Руска-турэцкія войны. Дзеянні ўзброеных сіл Расіі ў Італіі і Швейцарыі.

**Узмацненне абсалютызму ў Расіі.** Развіццё прамысловасці. Унутраны і знешні гандаль. Узмацненне дыктатуры дваран. Сялянскае пытанне. (Павел I і дваранства.) Узмацненне абсалютызму.

**Развіццё культуры ў другой палове XVI—XVII стст.** Фальклор. Літаратура. Пачатак кнігадрукавання. Асвета. Школа. Дойлідства. Быт сялян і гараджан у XVI ст. Быт баяр, дваран, купцоў.

**Руская культура ў XVIII ст.** Асаблівасці развіцця культуры. Асвета. Развіццё навукі. Архітэктура. Тэатр. Перамены ў быце.

**«Асветны абсалютызм». Рускае асветніцтва.** Што такое «асветны абсалютызм». Кацярына II і «асветны абсалютызм». Уложаная камісія. Праблемы прыгоннага права. (М. Навікоў.) Радзішчаў — першы рускі рэвалюцыянер. Самадзяржаўе і французская рэвалюцыя.

### Тэма 8. Славянскія краіны (2 г)

**Расія і Рэч Паспалітая.** Процістаянне Расіі і Рэчы Паспалітай ў XVII—XVIII стст. Нацыянальна-вызваленчы рух. Падзелы Рэчы Паспалітай і лёсы славян. Беларусь і Украіна ў складзе Расіі.

**Нацыянальна-вызваленчая барацьба славянскіх народаў.** Польскія і ўкраінскія землі пад уладай Аўстрыі. Польскія землі ў складзе Прусіі. Чэхія і Славакія пад уладай Габсбургаў. Славяне пад уладай Турцыі.

Урок абагульнення (1 г).

## Раздзел IV

## УСХОДНІЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ І АФРЫКА (9 г)

### Уводзіны (1 г)

Асноўныя рысы і прыкметы ўсходніх цывілізацый у новы час. Асаблівасці дзяржаўнага ладу і ваеннай арганізацыі ўсходніх грамадстваў. (Ідэалогіі і рэлігіі.)

Кантакты ўсходніх грамадстваў паміж сабой і еўрапейскімі дзяржавамі. Прычыны лёгкасці каланіяльных захопаў.

### Тэма 9. Японія (1 г)

**Духоўнае і матэрыяльнае жыццё японскага грамадства.** Рэлігіі. Сінтаізм і будызм. Канфуцыянства. Японскія гарады. Рамяство і гандаль. Аграрныя зносіны.

**Сёгунат Такугава.** Аб'яднанне краіны і ўтварэнне сёгуната Такугава. (Характарыстыка сёгуната. Саслоўі.) Унутраная і знешняя палітыка Такугава. «За-

крыццё» краіны. Крызіс сёгуната ў канцы XVIII ст. Культура перыяду Такугава.

Тэма 10. Кітай (2 г)

**Кітай пад уладай Цынскай дынастыі.** Маньчжурскае заваяванне. (Дзяржаўны лад. Саслоўі.) Унутраная і знешняя палітыка. «Закрыццё» краіны. Абвастрэнне крызісу феадальных зносін у канцы XVIII ст.

**Духоўнае і матэрыяльнае жыццё.** Культура. Уяўленні аб Сусвеце. Вера ў духаў. Культ продкаў. (Канфуцыянства. Даасізм. Будызм.) Кітайскі горад. Рамяство і гандаль. Культура. Школа і адукацыя.

**Спосаб жыцця.** Традыцыі і абрады. Бытавыя ўмовы. Сямейны ўклад.

Тэма 11. Індыя (2 г)

**Індыя ў перыяд Магольскай імперыі.** Утварэнне Магольскай дзяржавы. Дзяржаўны лад. (Ваенна-ленная сістэма. Касты. Праўленне Аўрангзеба.) Індыйскі горад. Вясковая абшчына. Гандаль і рамяство. Ліхвярства.

**Англійскія заваяванні ў Індыі (XVIII ст.)** Паслабленне і распад Магольскай імперыі. (Еўрапейскія гандлёвыя кампаніі ў Індыі.) Англа-французская барацьба за Індыю. Англійскае заваяванне Бенгаліі і Паўднёвай Індыі.

**Культура.** Агульная характарыстыка культуры. Традыцыйныя вераванні і рэлігіі. Літаратура. Гісторыя. Астраномія. Жывапіс. Архітэктура.

Тэма 12. **Араба-мусульманская цывілізацыя (1 г)**

**Уводзіны.** Заняпад ісламскай цывілізацыі ў новы час. Месца і роля ісламу ў грамадскім і палітычным жыцці.

**Арабскія краіны ў складзе Асманскай імперыі ў XVII—XVIII стст.** Агульная характарыстыка Асманскай імперыі. Егіпет. Сірыя і Ліван. Ірак. Аравія. (Узнікненне вахабізму.) Французская экспедыцыя ў Егіпет і яе вынікі.

Арабская культура ў XVII—XVIII стст.

Тэма 13. **Афрыка на поўдзень ад Сахары (1 г)**

**Агульная характарыстыка афрыканскіх народаў.** Сустрэча з Еўропай. Еўрапейскі гандаль рабамі і яго згубныя вынікі для Афрыкі. Афрыканскае мастацтва.

**Выніковае абагульненне.**

Асноўныя заканамернасці і асаблівасці гістарычнага развіцця чалавецтва ў новы час.

### Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Змест паняццяў «новая гісторыя», «цывілізацыя», «капіталізм», «буржуазная рэвалюцыя». Перыядызацыя новай гісторыі.

Адрозненне гістарычнага развіцця Еўропы ад іншых рэгіёнаў свету.

Характэрныя рысы гістарычнага развіцця Расіі і славянскіх краін.

Асаблівасці гісторыі краін Амерыкі, Азіі і Афрыкі.

Рэлігійныя сістэмы Еўропы і Усходу і іх уплыў на сацыяльнае, палітычнае і культурнае жыццё грамадства.

Буржуазныя рэвалюцыі, іх змест, характар і значэнне.

Зараджэнне сучаснай еўрапейскай навукі і рацыяналістычнага погляду на свет.

Асноўныя дасягненні сусветнай культуры XVI—XVIII стст.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ НОВАГА ЧАСУ

### 34 гадзіны (у тым ліку 3 гадзіны — рэзервовыя)

## Раздзел I

## АФАРМЛЕННЕ ФАЛЬВАРКОВА-ПАНШЧЫННАЙ СІСТЭМЫ І ШЛЯХЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ (XVI — першая палова XVII ст.) (17 г)

### Тэма 1. Палітычнае становішча Беларусі (10 г)

**Тэрыторыя, насельніцтва.** Межы Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Прыродныя ўмовы. Колькасць,

этнічная прыналежнасць, веравызнанне насельніцтва. (Назвы і саманазвы беларусаў у XVI—XVIII стст.)

**Дзяржаўны лад і войска.** Вышэйшыя органы ўлады. Мясцовае кіраванне. Заканадаўства. Колькасць, арганізацыя, узброенасць войска.

Знешнепалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага ў канцы XV — першай палове XVI ст. Набегі крымскіх татар. Узаемаадносіны з Масквой.

**Мяцеж Міхаіла Глінскага.** Прычыны выступлення. Колькасць і склад удзельнікаў. Ход паўстання. Вынікі і значэнне.

**Змены ва ўнутрыпалітычным становішчы Вялікага Княства.** Усталяванне рэлігійнай талерантнасці. Адмена Гарадзельскага прывілея. Заканадаўства Вялікага княства Літоўскага аб верацярпімасці. Унутрыпалітычныя супярэчнасці.

**Лівонская вайна.** Прычыны і пачатак Лівонскай вайны. Наступленне маскоўскага войска. Заключэнне перамір'я ў 1582 годзе.

**Люблінская вунія (1569). Утварэнне Рэчы Паспалітай.** Унутры- і знешнепалітычныя прычыны аб'яднання з Польшчай. Скліканне супольнага польска-вялікакняскага сойму ў Любліне. Спрэчкі аб умовах уніі. Незаконнае далучэнне Польшчай часткі зямель ВКЛ. Прынячце акта 1 ліпеня 1569 г. аб утварэнні Рэчы Паспалітай, яго змест і значэнне.

**Барацьба за захаванне самастойнасці Вялікага княства Літоўскага.** Незадаволенасць большасці шляхты Вялікага княства вынікамі вуніі з Польшчай. Распаўсюджванне антыпольскіх настрояў і барацьба за «старыну». Захаванне агульнадзяржаўных соймаў Вялікага княства Літоўскага. Распрацоўка і прынячце Статута (1588) як спроба зберагчы самастойнасць Княства. Леў Сапега — выдатны грамадска-палітычны дзеяч.

**Рэч Паспалітая — федэратыўная дзяржава шляхецкіх вольнасцей.** Далучэнне шляхты Вялікага княства да «залатых вольнасцей» польскай шляхты. Паступовая паланізацыя сацыяльных вярхоў беларускага грамадства і інтэлігенцыі. Фарміраванне новай сацыяльна-палітычнай супольнасці — «польскага народа шляхецкага».

**Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у канцы XVI — першай палове XVII ст.** Усходняя палітыка С. Баторыя пасля Лівонскай вайны. Кандыда-

тура рускага цара на каралеўскі трон. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай на Маскву ў пачатку XVII ст. Барацьба за Смаленск у 30-я гады XVII ст.

### Тэма 2. Сельская гаспадарка і гарадское жыццё (2 г)

**Усталяванне паншчыны і прыгонніцтва ў беларускай вёсцы.** Сялянская гаспадарка. Промыслы і рамяство. Феадальнае землеўладанне. Станаўленне фальваркова-паншчыннай сістэмы. Аграрная рэформа. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі сялян. Запрыгоньванне сялянства. Антыфеадальнае супраціўленне.

**Урбанізацыя.** Колькасны рост гарадскіх паселенняў. Гарады — цэнтры гандлю і рамяства. Магдэбургіі. Юрыдыкі. Цэхі. Гандлёвыя сувязі беларускіх гарадоў. Мястэчкі. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах.

### Тэма 3. Царква і рэлігія. Культура Беларусі (4 г)

**Праваслаўе і каталіцызм. Рэфармацыя.** Прывілеі каталіцкай царквы. Крызіс праваслаўнай царквы. Перадумовы рэфармацыйнага руху. Пашырэнне Рэфармацыі ў Беларусі. Дзеячы Рэфармацыі (Сымон Будны, Мікалай Радзівіл Чорны, Васіль Цяпінскі). Контррэфармацыя.

**Уніяцтва ў Беларусі.** Берасцейская царкоўная вунія 1596 г. Гвалтоўнае насаджэнне вуніяцкай царквы ў канцы XVI — пачатку XVII ст. Уніяцкія дзеячы (І. Пацей, І. Кунцэвіч). Антывуніяцкі рух. М. Сматрыцкі. А. Філіповіч. Паступовае пашырэнне вуніяцтва сярод сельскага насельніцтва і гарадскіх нізоў.

**Францыск Скарына — усходнеславянскі асветнік і гуманіст.** Сувязь беларускага Адраджэння з заходнееўрапейскім. Біяграфія Скарыны. Погляды Скарыны. Велічнасць постаці ўсходнеславянскага асветніка.

**Беларускае Адраджэнне.** Кнігадрукаванне ў Беларусі. Літаратура рэлігійная і свецкая. Грамадска-палітычная і філасофская думка. Выяўленчае мастацтва. Музыка. Дойлідства. Дзеячы Адраджэння: М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі, Л. Сапега, А. Рымша і іншыя.

Урок абагульнення (1 г).

## Раздзел II

## ВОЙНЫ СЯРЭДЗІНЫ XVII—XVIII стст. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ І ПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ (14 г)

### Тэма 4. Ваенныя дзеянні 1648—1667 гадоў (2 г)

**Казацка-сялянская вайна 1648—1651 гадоў.** Яе прычыны і сувязь з паўстаннем пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага. Казацкія загоны Галавацкага, Галоты, Нябабы і іншых на Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў і шляхецкага апалчэння на поўдні Беларусі ў 1648—1649 гадах. Страты. Антыфеадальны характар вайны.

**Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654—1667 гадоў.** Прычыны, пачатак баявых дзеянняў і поспехі маскоўскага войска. Народны рух у другой палове 50-х — пачатку 60-х гадоў XVII ст. Вызваленне тэрыторыі Беларусі і Андрусаўскае перамір'е (1667). Вынікі вайны для Беларусі.

### Тэма 5. Шляхецкая анархія. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі (5 г)

**Барацьба магнацкіх груповак.** Канфлікты паміж Радзівіламі, Сапегамі, Пацамі, Агінскімі, Вішнявецкімі. Грамадзянская вайна канца XVII — пачатку XVIII ст. Стварэнне Сандамірскай канфедэрацыі прыхільнікаў Аўгуста II і канфедэрацыі ў падтрымку Ст. Ляшчынскага.

**Беларусь у гады Паўночнай вайны.** Саюз Рэчы Паспалітай з Расіяй. Баявыя дзеянні на Беларусі. Бітва пад Лясной (1708). Вынікі вайны для Беларусі.

**Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай.** Паслабленне цэнтральнай улады і разгул анархіі. Умяшальніцтва суседніх краін ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Слуцкая, Торуньская, Барская, Таргавіцкая канфедэрацыі. Першы падзел Рэчы Паспалітай (1772) і далучэнне да Расіі Усходняй Беларусі. Спробы рэформ. Канстытуцыя 3 мая 1791 года. Інтэрвенцыя Расіі ў Рэч Паспалітую (1792). Другі падзел Рэчы Паспалітай і ўключэнне ў склад Расійскай імперыі цэнтральнай часткі Беларусі.

**Паўстанне Т. Касцюшкі. Канец Рэчы Паспалітай.** Падрыхтоўка і пачатак паўстання. Постаць Т. Касцюшкі. Ход паўстання на Беларусі. Я. Ясінскі, М. К. Агін-

скі. Паражэнне паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне Заходняй Беларусі да Расійскай імперыі.

### Тэма 6. Сацыяльна-эканамічнае становішча. Культура Беларусі (5 г)

**Беларуская вёска XVII—XVIII стст.** Сельская гаспадарка Беларусі ў час войнаў сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст. Гаспадарчае ажыўленне ў другой палове XVIII ст. Юрыдычнае становішча сялян. Павіннасці і дзяржаўныя паборы.

**Антыфеадальны сялянскі рух.** Супраціўленне сялян узмацненню феадальнага прыгнёту. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы ў Крычаўскім старостве (1740—1744). (Паўстанне на Каменшчыне ў сярэдзіне XVIII ст.)

**Гарады Беларусі.** Заняпад гарадскога жыцця ў час ваеннага ліхалецця і яго паступовае ажыўленне. Колькасць і структура гарадскіх паселішчаў. Насельніцтва гарадоў. Рамесная вытворчасць і гарадскі гандаль. Гандлёвыя сувязі. Самакіраванне. Сацыяльная барацьба ў беларускіх гарадах.

**Культура Беларусі.** Стан асветы. Навука. Беларуска-рускія культурныя сувязі. Сімяон Полацкі. Казімір Лышчынскі. Ілья Капіевіч. Мецэнацтва. Літаратура. Музыка. Тэатр. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура.

**Беларускі народ у XVI—XVIII стст.** Самасвядомасць. Вераванні, звычаі, традыцыі.

**Наш край у XVI—XVIII стст.**

**Выніковае абагульненне (2 г)**

Беларускае Адраджэнне ў XVI — першай палове XVII ст. Агульнае і адметнае ў гісторыі беларускага і заходнееўрапейскага Рэнесансу. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў другой палове XVII—XVIII стст.

### Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Дзяржаўны лад і органы кіравання Вялікага княства Літоўскага. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Заканадаўства (Статуты Вялікага княства Літоўскага). Рэлігія. Рэфармацыйны рух. Месца і роля

беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім, Рускім, Жамойцкім.

Рэч Паспалітая — федэратыўная дзяржава. Права «ліберум вета». Дысідэнцкае пытанне. Уніяцкая царква. Канфедэрацкі рух. Канстытуцыя. Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Фальваркова-паншчынная сістэма. Сялянская гаспадарка. Запрыгоньванне. Антыфеадальны рух (скаргі, уцёкі, адказ ад выканання павіннасцей, узброеныя паўстанні). Урбанізацыя. Магдэбургскае права. Цэхавая арганізацыя. Мануфактурная вытворчасць. Рынак унутраны і знешні.

Асноўныя сферы матэрыяльнай і духоўнай культуры. Рэнесанс. Гуманізм. Асаблівасці беларускага Адраджэння, яго знакамітыя дзеячы. Кнігадрукаванне. Брацтвы. Мецэнацтва. Асветніцтва. Побыт, звычаі, характар беларусаў. Уклад беларусаў у агульнаеўрапейскую куьтуру.

### Асноўныя ўменні вучняў

Вызначаць храналогію падзей;

вывучаць гістарычныя крыніцы (пісьменныя, матэрыяльныя);

аналізаваць гістарычныя факты, раскрываць прычынна-следчыя сувязі, параўноўваць з'явы і падзеі, вызначаць асноўныя і другарадныя характарыстыкі;

працаваць з гістарычнай картай: чытаць яе і выкарыстоўваць як крыніцу ведаў;

даваць ацэнку асобным з'явам культуры;

складаць расказы па тэксту падручніка і другіх крыніцах ведаў;

даваць характарыстыку гістарычным дзеячам, прадстаўнікам асобных сацыяльных груп;

фармуляваць свае думкі, даваць ацэнку адказаў другіх вучняў, удзельнічаць у абмеркаванні гістарычных падзей і з'яў.

# 8 КЛАС

# СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НОВАГА ЧАСУ (XIX ст.— 1918 г.)

## 51 гадзіна (у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)

### Уводзіны (1 г)

Набыццё гісторыяй сусветнага характару. Асноўныя дасягненні еўрапейскай цывілізацыі ў XIX ст. Фарміраванне дэмакратычных прававых, грамадзянскіх традыцый. Развіццё індустрыяльнага грамадства. Еўрапейская цывілізацыя — лідэр сусветнай гісторыі.

## Раздзел I

## ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА (20 г)

### Уводзіны (1 г)

Асноўныя рысы гістарычнага развіцця Заходняй Еўропы ў XIX — пачатку XX ст. Рост насельніцтва і гарадоў. Войны і рэвалюцыі. Надзеі і аптымізм еўрапейцаў.

### Т э м а 1. Перыяд напалеонаўскіх войнаў у Еўропе (2 г)

**Напалеонаўская Францыя і Еўропа.** Устанаўленне дыктатуры Напалеона Банапарта ў Францыі. Характар і мэты напалеонаўскіх войнаў. Англа-французская барацьба за сусветнае панаванне. Разгром Прусіі. Уварванне французскіх войск у Партугалію і Іспанію. (Вайна Напалеона з Аўстрыяй і яе вынікі.) Разгром напалеонаўскай арміі ў Расіі. Вынікі і значэнне напалеонаўскіх войнаў.

**Венскі кангрэс.** Стварэнне «Венскай сістэмы» міжнародных адносін і яе прынцыпы. Утварэнне Свяшчэннага саюза, яго роля ў еўрапейскай палітыцы. Падзел напалеонаўскай спадчыны. (Тайны саюз Англіі, Аўстрыі і Францыі супраць Расіі.)

### Тэма 2. Палітычнае развіццё і сацыяльна-эканамічныя працэсы ў буйнейшых еўрапейскіх дзяржавах у XIX — пачатку XX ст. (8 г)

**Асноўныя рысы эканамічнага развіцця капіталістычных краін.** Агульная характарыстыка эканамічнага развіцця. Далейшы ўздым вытворчых сіл. Ход прамысловай рэвалюцыі ў Еўропе і яе сацыяльныя вынікі.

Тэхнічны прагрэс у прамысловасці і земляробстве ў другой палове XIX ст. Пераход ад свабоднай канкурэнцыі да манаполіі. (Формы манапалістычных аб'яднанняў. Утварэнне капіталістычнай сістэмы сусветнай гаспадаркі.) Рост урбанізацыі. Развіццё сродкаў транспарту і сувязі. (Выдавецкая дзейнасць.) Зрухі ў галіне народнай адукацыі.

**Англія ў першай палове XIX ст.** Дзяржаўны лад. Органы ўлады. (Сістэма двюх партый.) Асаблівасці развіцця англійскага капіталізму. Рабочы рух. Чартызм. Трэд-юніянізм. Знешняя і каланіяльная палітыка ў першай палове XIX ст.

**Англія ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Эканамічнае развіццё. Палітычны лад. Унутраная і знешняя палітыка ліbeралаў і кансерватараў у 70—90-я гады. (Англа-бурская вайна.) Рост англа-германскіх супярэчнасцей. Рабочы рух. Утварэнне лейбарысцкай партыі.

**Францыя ў першай палове XIX ст.** Ліпеньская рэвалюцыя 1830 года. Устанаўленне буржуазнай манархіі. Унутраная і знешняя палітыка. (Заваяванне Алжыра.) Крызіс ліпеньскай манархіі. Рэвалюцыя 1848—1849 гадоў. Францыя ў гады Другой імперыі.

**Францыя ў канцы XIX — пачатку XX ст.** Франка-пруская вайна. Рэвалюцыя 4 верасня 1870 года. Франкфурцкі мір. Парыжская Камуна (1871). Спроба рэстаўрацыі манархіі. Перамога рэспубліканскага ладу. Канстытуцыя Трэцяй рэспублікі (1875).

Францыя напярэдадні першай сусветнай вайны. (Радыкальныя кабінеты, іх унутраная і знешняя палітыка.) Эканамічнае развіццё. Рабочы і сацыялістычны рух.

**Рэвалюцыі 1848—1849 гадоў у Германіі, Італіі і Аўстрыйскай імперыі.** Прычыны і перадумовы рэвалюцый. (Унутрыпалітычная абстаноўка.) Рэвалюцыя

ў Германіі. Рэвалюцыя ў Італіі. Аб'яднанне Італіі ў 50—60-х гадах XIX ст. Рэвалюцыя ў Аўстрыйскай імперыі. Галоўныя вынікі рэвалюцый.

**Германія ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Аб'яднанне Германіі і абвяшчэнне Германскай імперыі. Эканамічнае развіццё краіны ў апошняй трэці XIX — пачатку XX ст. Палітычны лад. Унутраная і знешняя палітыка. Германскія каланіяльныя захопы ў Афрыцы. (Пераход ад «кантынентальнай» да «сусветнай» палітыкі.)

**Рабочы і сацыялістычны рух у другой палове XIX — пачатку XX ст.** Рост сацыяльнай актыўнасці працоўных. Дзейнасць рабочых партый і арганізацый асобных краін. I Інтэрнацыянал. Утварэнне і дзейнасць II Інтэрнацыянала. Еўрапейская сацыял-дэмакратыя. (Плыні ў рабочым і сацыялістычным руху: рэфармізм, марксізм, анарха-сіндыкалізм.) Дзеячы рабочага і сацыялістычнага руху: К. Маркс, Ф. Энгельс (А. Бебель, Э. Бернштэйн, К. Каўцкі), У. Ленін.

### Т э м а 3. Міжнародныя адносіны ад Венскага кангрэса да першай сусветнай вайны (1815—1914 гады) (3 г)

**«Венская сістэма» у першай палове XIX ст.** Кангрэсы Свяшчэннага саюза. (Дактрына «узброенага ўмяшання» ва ўнутраныя справы дзяржаў.) Рэвалюцыі 1848—1849 гадоў і крызіс «Венскай сістэмы». Абвастрэнне ўсходняга пытання. Крымская вайна. Крах «Венскай сістэмы».

**Еўропа на шляху да ўтварэння ваенна-палітычных блокаў.** Абвастрэнне супярэчнасцей у сувязі з аб'яднаннем Італіі і Германіі. Франка-прускі антаганізм. Сістэма «узброенага міру» ў Еўропе.

**Утварэнне ваенна-палітычных блокаў.** Раздзяленне дзяржаў кантынента на два варожыя блокі. Каланіяльная палітыка еўрапейскіх дзяржаў. (Абвастрэнне барацьбы за калоніі, рынкі збыту, крыніцы сыравіны.) Завяршэнне тэрытарыяльнага падзелу свету паміж вядучымі капіталістычнымі дзяржавамі. Міжнародныя адносіны ў пачатку XX ст. Абвастрэнне барацьбы паміж Антантай і Траістым саюзам. (Міжнародныя канфлікты ў пачатку XX ст.) Наспяванне першай сусветнай вайны.

### Т э м а 4. Еўрапейская культура ў XIX — пачатку XX ст. (5 г)

**Уводзіны.** Што такое культура. Асноўныя тэндэнцыі развіцця еўрапейскай культуры. Узаемаўплыў нацыянальных культур. Крызіс еўрапейскага гуманізму.

**Развіццё навукі і тэхнікі.** Пераварот у тэхніцы. Развіццё металургіі і машынабудавання, транспарту і сувязі. Дасягненні ў навуцы. (Рэвалюцыя ў прыродазнаўстве.) Вучэнне Ч. Дарвіна і фарміраванне новай карціны свету.

**Літаратура.** Р а м а н т ы з м. Лідэр французскага рамантызму В. Гюго. Англійскія паэты-рамантыкі Дж. Байран (П. Б. Шэлі, Дж. Кітс). В. Скот. Э. Т. Гофман. А. Міцкевіч.

Р э а л і з м. А. Стэндаль. А. Бальзак, Ч. Дзікенс, Г. Гейнэ. Д э к а д а н с. Адчуванне трагічнасці жыцця ў творчасці французскіх паэтаў другой паловы XIX ст. (Ш. Бадлер, А. Рамбо, П. Варлен, Г. Апалінэр). Іх прадказанні сацыяльных узрушэнняў. Р. Кіплінг.

**Жывапіс.** Рамантызм і рэалізм у жывапісе. Ф. Гоя, Э. Дэлакруа, Г. Курбэ і Ж. Міле. Імпрэсіянізм. (А. Рэнуар і К. Манэ.) В. Ван Гог, П. Сезан, П. Гаген. Сімвалізм. (А. Радэн).

У р о к а б а г у л ь н е н н я. Асноўныя тэндэнцыі развіцця заходнееўрапейскай цывілізацыі ў XIX — пачатку XX ст.

## Раздзел II

## ПАЎНОЧНААМЕРЫКАНСКАЯ І ЛАЦІНААМЕРЫКАНСКАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ Ў XIX — ПАЧАТКУ XX ст. (6 г)

### Уводзіны (1 г)

Адзін кантынент — дзве Амерыкі. Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў цывілізацый. Сувязь з заходнееўрапейскай цывілізацыяй. Асаблівасці духоўнага і матэрыяльнага жыцця.

### Т э м а 5. Паўночнаамерыканская цывілізацыя (3 г)

**Палітычнае і сацыяльнае развіццё ЗША ў канцы XVIII — сярэдзіне XIX ст.** Вайна за незалежнасць і яе вынікі. Расшырэнне тэрыторыі ЗША і рост насельніцтва. Поўнач і Поўдзень — два шляхі развіцця.

Фермерства. Плантацыйнае рабства. (Становішча неграў. Паўстанні рабоў.) Рух за адмену рабства. Абаліцыянізм.

**Грамадзянская вайна 1861—1865 гадоў і яе вынікі.** Прычыны і перадумовы. (Прыход да ўлады рэспубліканскай партыі.) Аўраам Лінкальн — прэзідэнт ЗША. Пачатак грамадзянскай вайны паміж Поўначчу і Поўднем. Першы этап вайны (1861—1862). Акт аб гамстэдах і пракламацыя аб знішчэнні рабства. Другі этап грамадзянскай вайны. Перамога Поўначы.

**ЗША пасля грамадзянскай вайны.** Эканамічнае развіццё. Панаванне буйной буржуазіі. Двухпартыйная сістэма. Знешняя палітыка ЗША. Выхад ЗША на арэну сусветнай палітыкі.

**Амерыканская літаратура ад «Спеву аб Гаяваце» да «Амерыканскай трагедыі».** Амерыканскі рамантызм. Яго асаблівасці. Г. Лангфела і Ф. Купер, Г. Бічэр-Стоў, «Лісце травы» У. Уітмена. Першыя перасцярогі (Г. Мелвіл, Г. Тора). Прадстаўнікі амерыканскага рэалізму (М. Твэн, Брэт Гарт, Дж. Лондан, Т. Драйзер).

### Тэма 6. Лацінаамерыканская цывілізацыя (2 г)

**Краіны Лацінскай Амерыкі ў першай палове XIX ст.** Гістарычная даведка. Асаблівасці развіцця. Насельніцтва. Еўрапейцы, індзейцы і негры. Змяшэнне этнасаў.

Вайна за незалежнасць іспанскіх калоній (1810—1826). Узнікненне самастойных лацінаамерыканскіх рэспублік.

**Краіны Лацінскай Амерыкі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Развіццё капіталізму. Адмена рабства і абвяшчэнне рэспублікі ў Бразіліі. Барацьба Кубы за незалежнасць. Рэвалюцыя 1910—1917 гадоў у Мексіцы.

Урок абагульнення. Асноўныя тэндэнцыі развіцця ЗША і Лацінскай Амерыкі.

## Раздзел III

## РАСІЙСКАЯ ІМПЕРЫЯ. СЛАВЯНСКІЯ КРАІНЫ (13 г)

### Тэма 7. Расія ў XIX ст. (3 г)

**Спробы рэформаў у пачатку XIX ст.** Расійская імперыя ў пачатку XIX ст. Тэрыторыя і межы.

Дзяржаўны лад. Саслоўі і класы. Аляксандр I. Айчынная вайна 1812 года.

**Палітычнае і сацыяльнае развіццё Расіі (1815—1855).** Зварот да рэформ. Дзекабрысты. Мікалай I. Унутраная палітыка. Сялянскае пытанне. (Заходнікі і славянафілы. Петрашэўцы.) Знешняя палітыка ў другой чвэрці XIX ст. Крымская вайна.

**Буржуазныя рэформы (1855—1894).** Аляксандр II. Прычыны рэформ. Ліберальны лагер. Рэвалюцыйная дэмакратыя. Сялянская рэформа. (Земская і гарадская рэформы. Судовая рэформа. Ваенная рэформа.) Значэнне буржуазных рэформ. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Прамысловы пераварот.

Народнікі. Тры напрамкі ў рэвалюцыйным народніцтве. Царазабойства 1 сакавіка 1881 года. Палітычная рэакцыя.

### Тэма 8. Развіццё грамадскіх адносін і сацыяльныя ўзрушэнні ў пачатку XX ст. (4 г)

**На шляху да рэвалюцыі.** Расія на рубяжы XIX—XX стст. Класы і саслоўі. Дзяржаўны лад. Утварэнне палітычных партый (РСДРП і партыя эсэраў). Ліберальны рух. Наспяванне рэвалюцыйнага крызісу. Руска-японская вайна. Портсмуцкі мір.

**Першая расійская рэвалюцыя (1905—1907).** Пачатак рэвалюцыі. (Тры лагеры ў рэвалюцыі.) Маніфест 17 кастрычніка 1905 года. Стварэнне новых палітычных партый. Снежаньскае ўзброенае паўстанне. Нацыянальна-вызваленчы рух. Спад рэвалюцыі. Дзяржаўная дума. Дзяржаўны пераварот 3 чэрвеня 1907 года. Вынікі рэвалюцыі.

**Расія паміж дзвюма рэвалюцыямі.** Трэцячэрвеньская манархія. Сталыпінская аграрная рэформа. (Прамысловы ўздым.) Новы ўздым агульнадэмакратычнага руху. IV Дзяржаўная дума.

**Лютаўская рэвалюцыя. Двоеўладдзе (люты—чэрвень 1917 года).** Напярэдадні рэвалюцыі. Пачатак першай сусветнай вайны. Узрастанне палітычнага крызісу. Паўстанне ў Петраградзе. Канец самадзяржаўя. (Стварэнне Петраградскага Савета. Стварэнне Часовага ўраду.) Устанаўленне двоеўладдзя. (Расклад палітычных сіл. Расійская сацыял-дэмакратыя ў красавіку 1917 года. Першы ўрадавы крызіс.) Расія

на пераломе (чэрвень 1917 года). Значэнне Лютаўскай рэвалюцыі.

### Тэма 9. Культура Расіі ў XIX — пачатку XX ст. (2 г)

**Асаблівасці развіцця культуры ў першай палове XIX ст.** Асвета. Навука. Літаратура. Выяўленчае мастацтва. Музыка.

**Руская культура ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Асвета. Навука. Літаратура. Тэатр. Жывапіс. «Сярэбраны век» рускай культуры. Агульныя ўмовы развіцця культуры ў пачатку XX ст. Тэхнічныя нова-ўвядзенні. Кнігавыдавецкая дзейнасць. Музыка. (Міжнароднае прызнанне рускага мастацтва.)

### Тэма 10. Славянскія народы і краіны ў XIX — пачатку XX ст. (2 г)

**Славянскія народы ў барацьбе за нацыянальнае вызваленне.** Палітычнае становішча ў першай палове XIX ст. Народы Польшчы, Беларусі, Украіны ў складзе Расійскай імперыі. Польскія землі пад уладай Прусіі. Становішча польскіх, чэшскіх і славацкіх зямель у складзе Аўстрыі. Барацьба славянскіх народаў супраць турэцкага ярма. Руска-турэцкая вайна 1877—1878 гг. і вызваленне Балгарыі. Утварэнне Балгарскага княства.

**Славянскія краіны і народы ў канцы XIX — пачатку XX ст.** Барацьба за дзяржаўную незалежнасць — адметная рыса эпохі. Палітычнае развіццё паўднёва-славянскіх народаў. Балканскія войны 1912—1913 гадоў. Польскі нацыянальна-вызваленчы рух. Барацьба чэхаў і славакаў за нацыянальнае адраджэнне і дзяржаўную незалежнасць. Асаблівасці развіцця культуры славянскіх народаў.

Урок абагульнення (1 г). Асноўныя тэндэнцыі развіцця Расійскай імперыі і славянскіх народаў у XIX — пачатку XX ст.

## Раздзел IV

## УСХОДНІЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ. АФРЫКА (9 г)

### Уводзіны

Асаблівасці гістарычнага развіцця ўсходніх цывілізацый. Лёс краін Усходу і Афрыкі ў эпоху каланіялізму. Вынікі еўрапейскай экспансіі.

Тэма 11. **Японія (2 г)**

**Буржуазная рэвалюцыя ў Японіі.** Крызіс рэжыму сёгуната Такугава. (Самурайская апазіцыя.) Насільнае «адкрыццё» Японіі і яго вынікі. Звяржэнне сёгуната (1868). Рэформы 1868—1873 гадоў.

**Ператварэнне Японіі ў каланіяльную дзяржаву.** Асаблівасці капіталістычнага развіцця. Канстытуцыя (1889). (Япона-кітайская вайна 1894—1895 гадоў.) Вайна з Расіяй. Знешняя палітыка напярэдадні першай сусветнай вайны.

Уплыў заходняй культуры. Змены ў ладзе жыцця японскага грамадства. (Пакланенне перад Захадам. Пашырэнне ідэі перавагі японцаў перад іншымі народамі.)

Тэма 12. **Кітай (2 г)**

**Кітай у першай палове XIX ст.** Кітайскае грамадства на мяжы XVIII—XIX стст. Рост насельніцтва. Уяўленні кітайцаў пра навакольнае асяроддзе. Духоўны свет і культура. (Культ імператара і павага да старэйшых.) Насільнае «адкрыццё» Кітая еўрапейцамі. Сялянская вайна тайпінаў (1850—1864).

**Ад паўстання тайпінаў да звяржэння Цынскай дынастыі і абвяшчэння рэспублікі.** Развіццё капіталізму. Падзел Кітая на сферы ўплыву замежнымі дзяржавамі. (Ператварэнне Кітая ў паўкалонію.) Рэфарматарскі рух. «Сто дзён рэформ». Паўстанне іхэтуаней. Рэвалюцыя 1911—1912 гадоў. (Сунь Ятсен. Звяржэнне Цынскай дынастыі.) Абвяшчэнне рэспублікі.

Тэма 13. **Індыя (1 г)**

**Індыя — англійская калонія.** Краіна і людзі ў пачатку XIX ст. Каставая сістэма. Як Англія захапіла Індыю. Англійская каланіяльная палітыка. Нацыянальнае паўстанне 1857—1859 гадоў. Развіццё культуры. Рам Рой.

**Індыя абуджаецца.** Індыя пасля паўстання сіпаяў. Эканамічнае развіццё. Фарміраванне капіталістычнага ўкладу. Сельская гаспадарка. Стварэнне арганізацыі Індыйскі нацыянальны кангрэс. (Цілак.) Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў 1905—1908 гадах.

Тэма 14. **Мусульманскі свет (2 г)**

**Роля ісламу. Рэформы і барацьба за нацыянальную незалежнасць.** Гістарычная даведка. Іслам і яго

уплыў на жыццё грамадства. (Роля мусульанскага духавенства.) Застой і заняпад мусульманскага свету.

Змаганне еўрапейскіх дзяржаў за Іран. Антыфеадальнае паўстанне бабідаў у Іране. Англа-афганскія войны XIX ст. Асманская імперыя — калос на гліняных нагах.

**Спроба рэформ у краінах мусульманскага свету (Турцыя, Іран, Егіпет).** Нацыянальна-вызваленчы рух. Антыкаланіяльнае паўстанне ў Алжыры (1830—1847). Паўстанне Арабі-пашы ў Егіпце (1881—1882). Рэвалюцыі пачатку XX ст. у Турцыі і Іране.

### Тэма 15. Афрыка на поўдзень ад Сахары (1 г)

**Каланізацыя афрыканскага кантыненту ў новы час.** Гістарычная даведка. Асаблівасці развіцця народаў Афрыкі. Гандаль рабамі. Тэрытарыяльны падзел Афрыкі ў XIX ст. Эфіопія супраць еўрапейскай каланізацыі.

Урок абагульнення. Асаблівасці гістарычнага развіцця краін Усходу і Афрыкі.

## Раздзел V

## ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА (3г)

**Прычыны і характар вайны.** Стратэгічныя планы ваюючых дзяржаў. Пачатак вайны. Ператварэнне вайны ў сусветную. Зрыў германскага плана «маланкавай вайны». Ваенныя дзеянні ў 1915—1916 гадах.

**Важнейшыя палітычныя падзеі і ваенныя дзеянні ў 1917—1918 гадах.** Набліжэнне палітычнага крызісу ў ваюючых дзяржавах. Уступленне ЗША ў вайну. Ход ваенных дзеянняў у 1917 годзе. Рэвалюцыі ў Расіі і Германіі. Паражэнне германскага блоку. Вынікі і ўрокі вайны.

**Выніковае абагульненне (1 г)**

Асноўныя тэндэнцыі і вынікі сусветнага развіцця ў XIX — пачатку XX стст.

### Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Сэнс паняццяў крызіс феадалізму, традыцыйнае грамадства, прамысловы пераварот, індустрыялізацыя, каланіялізм, імперыялізм, палітычныя партыі і арганізацыі.

Агульныя і адметныя рысы эканамічнага, сацыяльнага, духоўнага жыцця цывілізацый новага часу. Нераўнамернасці і асаблівасці гістарычнага развіцця краін Захаду і Усходу ў XIX — пачатку XX ст.

Рэформы і рэвалюцыі. Станаўленне нацый і дзяржаўнасці. Буржуазная дэмакратыя.

Месца рэлігій у грамадска-палітычным жыцці і культуры.

Каланіяльная палітыка і антыкаланіяльны рух.

Ідэйна-філасофскія плыні. Асноўныя дасягненні сусветнай культуры. Супярэчнасці і вынікі тэхнічнага перавароту ў XIX — пачатку XX ст.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ НОВАГА ЧАСУ (КАНЕЦ XVIII ст.— 1917 год)

## 34 гадзіны (у тым ліку 3 гадзіны — рэзервовыя)

### Раздзел і

### КРЫЗІС ПРЫГОННІЦКАЙ СІСТЭМЫ (КАНЕЦ XVIII — 50-я гады XIX ст.) (10 г)

#### Тэма 1. Палітычнае становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі (3 г)

**Палітыка царызму ў Беларусі (1772—1812).** Распаўсюджанне правоў і прывілеяў расійскага дваранства на беларускую шляхту. Тэрытарыяльна-адміністрацыйныя падзелы Беларусі і новая адміністрацыя. Раздача беларускіх зямель расійскім памешчыкам. Канфесійная палітыка. Мяжа яўрэйскай аседласці.

**Вайна 1812 года і Беларусь.** Акупацыя Беларусі войскамі Напалеона. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Пазіцыі магнатаў і шляхты. Спроба аднаўлення Вялікага княства Літоўскага. Партызанскі рух. Разгром французскага войска на Бярэзіне. Разарэнне краю.

**Грамадскі рух. Змены ў палітыцы царызму.** Філаматы і філарэты. Дзекабрысты на Беларусі. «Патрыятычнае таварыства». Паўстанне 1830—1831 гадоў.

Змены ў палітыцы самадзяржаўя.

**Тэма 2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Крызіс феадальна-прыгонніцкага ладу (3 г)**

**Сельская гаспадарка.** Землеўладанне і гаспадарка памешчыкаў. Рост паншчыны. Сялянская гаспадарка і павіннасці сялян. Асаблівасці становішча казённых сялян.

**Прамысловасць. Гандаль. Гарады і мястэчкі.** Дробнатаварная вытворчасць. Рамяство. Мануфактуры. Пачатак прамысловай рэвалюцыі. Выкарыстанне вольнанаёмнай працы. Слабасць гарадской прамысловасці. Знешні і ўнутраны гандаль. Колькасць і склад гарадскога насельніцтва. Падаткі і павіннасці гараджан. Іх побыт. Шляхі зносін.

**Крызіс феадальна-прыгонніцкага ладу.** Рэформы П. Кісялёва. Правал рэформы ў памешчыцкай вёсцы. Заняпад гаспадаркі памешчыцкіх сялян. Крызіс гаспадаркі памешчыкаў. Рост антыпрыгонніцкага сялянскага руху. Зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні.

**Тэма 3. Асвета і культура на Беларусі (3 г)**

**Народная адукацыя і навука.** Змены ў сістэме адукацыі. Палітыка царызму ў галіне народнай адукацыі. Тыпы школ. Полацкая езуіцкая акадэмія. Віленскі універсітэт. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Узмацненне палітычнага і ідэалагічнага ціску самадзяржаўя на грамадскае і культурнае жыццё ў Беларусі пасля падаўлення паўстання 1830—1831 гадоў. Развіццё навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. (Гістарычныя і этнаграфічныя даследаванні: М. Баброўскі, І. Даніловіч, З. Даленга-Хадакоўскі, Я. Чачот, П. Баброўскі.)

**Літаратура. Мастацтва. Друк. Бібліятэкі.** Станаўленне нацыянальнай мовы і літаратуры. Ананімныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Беларускі грунт творчасці А. Міцкевіча. Беларуская плынь у польскамоўнай «краёвай» літаратуры. Я. Баршчэўскі, П. Багрым, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Кіркор. Архітэктура. Тэатр і музыка. Д. і В. Стафановічы, Р. Падбярэзскі, А. Абрамовіч. Жывапіс. І. Аляшкевіч, Я. Дамель, В. Ваньковіч, І. Хруцкі. Перыядычныя выданні. Бібліятэкі.

Урок абагульнення. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця беларускага этнасу напрыканцы XVIII — 50-х гадах XIX ст.

## Раздзел II

# БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКОВЫ ПЕРЫЯД КАПІТАЛІЗМУ (60—90-я гады XIX ст.) (9 г)

### Тэма 4. Буржуазныя рэформы. Пераход да капіталістычнай гаспадаркі (3 г)

**Адмена прыгоннага права. Іншыя буржуазныя рэформы.** Аграрна-сялянская рэформа (1861). Новы парадак кіравання сялянамі. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 года. Вынікі сялянска-аграрных рэформаў.

Асаблівасці судовай і школьнай рэформаў. Звесткі аб ваеннай, гарадской і цэнзурнай рэформах. Рэжым выключных законаў. Асаблівасці контррэформаў у Беларусі.

**Развіццё капіталістычных адносін у вёсцы.** Рост буржуазнага землеўладання. Асаблівасці гэтага працэсу ў Беларусі. Аграрны крызіс 80-х гадоў і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі Беларусі. Галоўныя напрамкі спецыялізацыі.

**Транспарт. Прамысловасць. Гарады.** Будаўніцтва чыгунак. Важнейшыя чыгуначныя лініі. Іх уплыў на развіццё эканомікі. Станаўленне фабрычнай вытворчасці. Асаблівасці развіцця прамысловасці Беларусі ў 60—90-х гадах XIX ст. Рост гарадоў. Прамысловыя мястэчкі. Колькасць, нацыянальны склад гарадскога насельніцтва, пралетарыяту і буржуазіі.

### Тэма 5. Вызваленчая барацьба (3 г)

Рэвалюцыйныя дэмакраты і шляхецкія рэвалюцыянеры. «Чырвоныя» і «белыя». Праграмы памяркоўных «чырвоных» і К. Каліноўскага. «Мужыцкая праўда». Контррэвалюцыйны пераварот у Вільні. Партызанская тактыка паўстанцаў. М. Мураўёў і яго дзейнасць у краі. Вяртанне К. Каліноўскага да кіраўніцтва паўстаннем. Падаўленне паўстання. «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага. Характар, вынікі і значэнне паўстання.

**Сялянскі рух. Дзейнасць народнікаў.** Становішча сялян. Формы і дынаміка сялянскага руху. Рэвалюцыйныя народнікі. М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў, І. Грынявіцкі, Г. Гельфман. Народніцкія арганізацыі ў Беларусі. Ідэйна-арганізацыйны крызіс народніцтва ў 80-я гады. Адраджэнне рэвалюцыйнага народніцтва ў канцы 90-х гадоў.

**Рабочы рух.** **Утварэнне і дзейнасць сацыял-дэмакратычных арганізацый.** Становішча, хваляванні і стачкі рабочых. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі. Э. Абрамовіч, І. Гурвіч, В. Сяліцкі, С. Трусевіч. Пераход сацыял-дэмакратаў да масавай агітацыі. А. Крэмер, Ю. Мартаў, Я. Спонці. Стачачныя касы. Утварэнне «Рабочага саюза Літвы» і Бунда. І з'езд РСДРП. Уздым рабочага руху ў другой палове 90-х гадоў. Першыя палітычныя выступленні рабочых.

### Тэма 6. Утварэнне беларускай нацыі. Культура Беларусі (3 г)

**Этнічныя працэсы.** Тэрыторыя і насельніцтва Беларусі. Асаблівасці саслоўнага і рэлігійнага складу беларускага, рускага, польскага і яўрэйскага насельніцтва. Сацыяльна-класавая структура беларускай нацыі. Развіццё нацыянальнай мовы і культуры. Зараджэнне беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

**Культура Беларусі ў другой палове XIX ст.** Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Навуковыя даследаванні. «Заходнерусізм»: М. Каяловіч, П. Шэйн, І. Насовіч, А. Семянтоўскі, М. Нікіфароўскі. Мастацкая літаратура. Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гурыновіч, К. Каганец. Выяўленчае мастацтва. А. Гараўскі, К. Альхімовіч, Н. Сіліванові. Архітэктура. Тэатр.

Урок абагульнення. Асаблівасці станаўлення буржуазнага грамадства ў Беларусі ў 60—90-я гады XIX ст.

## Раздзел III

## БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНЫХ РЭВАЛЮЦЫЙ (12 г)

### Тэма 7. Рэвалюцыя 1905—1907 гг. у Беларусі (4 г)

**Наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі.** Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і нацыянальнага пытання. Зубатаўшчына і сіяністкі рух у Беларусі. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Газета «Искра». Бальшавізм і меншавізм. Мясцовыя арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і «Польскай партыі сацыялістычнай на Літве». Утварэнне Беларускай са-

цыялістычнай грамады. Яе праграма і дзейнасць. Уздым рабочага руху. Пераход рабочых да палітычнай барацьбы. Сялянскі рух.

**Вызваленчы рух у перыяд наступлення рэвалюцыі.** Студзеньскі рух салідарнасці рабочых Беларусі з рабочымі Пецярбурга. Вясенне-летні ўздым палітычных выступленняў і эканамічнай барацьбы рабочых. Новыя формы сялянскага руху. Байкот Булыгінскай думы. Кастрычніцкая палітычная стачка ў Беларусі. Кааліцыйныя саветы і камітэты. Маніфест 17 кастрычніка. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Аддзелы «Саюза рускага народа» і «Саюза 17 кастрычніка». Буржуазна-ліберальны рух. Уздым сялянскага і салдацкага руху. Снежаньская палітычная стачка на Беларусі.

**Адступленне рэвалюцыі. Дэпутаты Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах.** Спад рэвалюцыйнага руху ў пачатку 1906 г. Выбары ў Дзяржаўную думу. Склад дэпутатаў ад 5 заходніх губерняў. Іх пазіцыі ў Думе. Вясенне-летні (1906) уздым рэвалюцыйнага руху. Наступленне контррэвалюцыі. Дзейнасць прафсаюзаў. Перамога на выбарах у II Дзяржаўную думу ў заходніх губернях рускіх і польскіх шавіністычна-клерыкальных груповак. Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот.

**Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гадоў.** Дзейнасць БСГ, яе лозунгі і патрабаванні ў 1905 годзе. II з'езд БСГ. Змены ў праграме. Газета «Наша доля». Сацыяльна-эканамічная, палітычная і нацыянальная праграма газеты «Наша ніва».

Значэнне і вынікі рэвалюцыі для Беларусі.

### Тэма 8. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Сталыпінскія рэформы. Грамадскі рух (3 г)

**Развіццё прамысловасці.** Крызіс і дэпрэсія 1900—1908 гадоў. Прамысловы ўздым. Рост акцыянернага капіталу і канцэнтрацыя вытворчасці. Далейшая спецыялізацыя прамысловасці. (Развіццё профільных галінаў.) Асаблівасці прамысловасці Беларусі.

**Аграрная рэформа і развіццё сельскай гаспадаркі.** Прычыны і мэты сталыпінскай аграрнай рэформы. Разбурэнне сялянскай абшчыны, насаджэнне хутароў. Арганізацыя перасялення сялян у азіяцкую частку Расіі. Вынікі і значэнне рэформы. (Далейшая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі і рост вытворчасці.)

Узмацненне сацыяльна-класавай дыферэнцыяцыі сялянства. Земская рэформа. Яе асаблівасці і значэнне.

**Палітычная рэакцыя. Грамадскі рух.** Асаблівасці новага выбарчага закона. Палітычныя рэпрэсіі і іх вынікі. Палітыка па нацыянальным пытанні. Дэпутаты III Дзяржаўнай думы ад 5 заходніх губерняў. Барацьба з беларускім нацыянальным рухам. Праграма «Белорусского общества». Л. Саланевіч. Дзейнасць польскіх нацыяналістычных груповак.

Змены ў дынаміцы і характары рабочага руху. Левыя партыі і арганізацыі. Дынаміка сялянскага руху. Яго асноўныя формы.

### Тэма 9. Беларусь у час першай сусветнай вайны. Лютаўская рэвалюцыя (2 г)

**Становішча ў Беларусі ў гады вайны.** Адносіны да вайны правых, буржуазна-ліберальных і сацыялістычных арганізацый, газеты «Наша ніва». Захоп немцамі Заходняй Беларусі. Масавае бежанства. Ваенныя павіннасці насельніцтва. Заняпад сельскай гаспадаркі. Мілітарызацыя прамысловасці і транспарту. Харчовы крызіс. Разгул спекуляцыі. Становішча рабочых. Асаблівасці рабочага і сялянскага руху ў прыфрантавых умовах. Пачатак разлажэння арміі. Беларускі нацыянальны рух у перыяд вайны.

**Лютаўская рэвалюцыя ў Беларусі.** Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Арганізацыя прафесійных саюзаў рабочых і служачых. Дэмакратызацыя войска. Абуджэнне вёскі. Палітычныя пазіцыі сялянства. З'езды сялянскіх дэпутатаў. Беларускі нацыянальны з'езд. Адносіны да беларускага руху расійскіх палітычных партый і арганізацый.

### Тэма 10. Уздым беларускага нацыянальна-культурнага руху. Культура Беларусі ў пачатку XX ст. (3 г)

**Газета «Наша ніва» — цэнтр адраджэння.** Сацыяльна-эканамічная і палітычная праграма «Нашай нівы» пасля трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту. Барацьба з шавіністычнымі рускімі і польскімі арганізацыямі і ўрадавай палітыкай па беларускім пытанні. Роля «Нашай нівы» ў развіцці беларускай культуры, фарміраванні і згуртаванні нацыянальнай інтэлігенцыі, міжнародным прызнанні беларускай нацыі.

**Асвета і навука. Літаратура і мастацтва.** Пашырэн-

не сеткі пачатковых, сярэдніх школ, настаўніцкіх інстытутаў і семінарый. Навуковыя даследаванні аб мове, этнаграфіі беларусаў, гісторыі Беларусі. Я. Карскі, М. Федароўскі, Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі. Развіццё перыядычнага друку і кнігадрукавання. Беларуская літаратура нашаніўскага перыяду. Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка, К. Каганец, Ц. Гартны, З. Бядуля, М. Гарэцкі. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. І. Буйніцкі, А. Бурбіс. Музыка. Выяўленчае мастацтва.

Урок абагульнення. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі ў пачатку XX ст.; яго вынікі і значэнне.

**Наш край у канцы XVIII — пачатку XX ст.**

## Агульнагістарычныя веды (ідэі, праблемы, паняцці)

Перыядызацыя гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.

Палітыка царызму ў Беларусі ў канцы XVIII — 50-х гадах XIX ст.

Вынікі вайны 1812 года для Беларусі.

Дзейнасць расійскіх і польскіх тайных арганізацый у Беларусі ў першай палове XIX ст.

Развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гарадоў ва ўмовах панавання феадальна-прыгонніцкіх адносін. Крызіс феадальна-прыгонніцкага ладу.

Змены ў сістэме і характары народнай адукацыі, развіццё навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ у першай палове XIX ст.

Асаблівасці буржуазных рэформаў у Беларусі. Рэжым надзвычайных законаў.

Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Прамысловая рэвалюцыя ў Беларусі. Нацыянальны склад гарадскога і сельскага насельніцтва, памешчыкаў і буржуазіі. Сацыяльная структура насельніцтва Беларусі.

Важнейшыя навуковыя даследаванні пра Беларусь і яе насельніцтва. Беларуская літаратура і развіццё нацыянальнай мовы. Друк, тэатр і выяўленчае мастацтва ў 60—90-х гадах XIX ст. Узровень народнай адукацыі.

Прычыны ўзнікнення і асноўныя праяўленні рэ-

валюцыйнай сітуацыі на Беларусі ў пачатку XX ст. Тры лагеры ў палітычнай барацьбе ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. Іх класавы і партыйны склад. Дынаміка рэвалюцыйнага працэсу, асноўныя мэты і формы барацьбы, яе вынікі.

Уздым беларускага нацыянальнага руху ў 1905—1914 гадах. Пазіцыі расійскіх урадавых і польскіх памешчыцка-клерыкальных груповак па беларускім пытанні.

Узровень сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі напярэдадні першай сусветнай вайны.

Становішча на Беларусі ў час першай сусветнай вайны.

Перамога буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады.

### Асноўныя ўменні вучняў

Суадносіць гістарычныя з'явы, працэсы з пэўным перыядам гісторыі, састаўляць храналагічныя табліцы;

аналізаваць і абагульняць гістарычныя факты і з'явы, вызначаць іх сутнасць і прычыны, ацэньваць значэнне (на аснове вывучэння тэксту падручніка, дакументаў і г. д.);

самастойна вывучаць параграф падручніка, гістарычныя дакументы;

працаваць з гістарычнай картай, даставаць з яе неабходныя звесткі аб гістарычных з'явах і працэсах;

складаць разгорнуты план на аснове тэксту падручніка або расказа настаўніка;

удзельнічаць у абмеркаванні гістарычных з'яў і падзей.

# 9 КЛАС

# СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ

## 68 гадзін
## (у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)

**Уводзіны (1 г)**

Паняцце «навейшы час». (Праблемы перыядызацыі.) Тэндэнцыі духоўнага, эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця краін свету ў XX ст. Уздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў краінах Азіі і Афрыкі. Дэкаланізацыя. Навукова-тэхнічны прагрэс і яго вынікі.

## Раздзел I
## КРАІНЫ СВЕТУ Ў 1918—1939 гадах (30 г)

**Уводзіны**

Свет пасля першай сусветнай вайны і асноўныя рысы яго развіцця. Уплыў расійскіх рэвалюцый на ход падзей у краінах Заходняй Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Раскол свету на дзве сістэмы. Рост супярэчнасцяў паміж еўрапейскімі дзяржавамі.

**Тэма 1. Краіны Захаду (9 г)**

**Рэвалюцыйныя падзеі ў Заходняй Еўропе (1918—1923).** Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі. Веймарская рэспубліка. Узнікненне фашысцкай партыі ў Германіі. Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі.

Народныя выступленні ў іншых еўрапейскіх краінах, забастовачная хваля ў ЗША. Узнікненне камуністычных партый, утварэнне Камуністычнага інтэрнацыянала.

**Зацвярджэнне асноў пасляваеннага свету.** Новая расстаноўка ваенна-палітычных сіл пасля першай сусветнай вайны. Парыжская мірная канферэнцыя. Мірныя дагаворы 1919—1920 гадоў. Вашынгтонская

канферэнцыя, Версальска-Вашынгтонская сістэма. Рапальскі дагавор.

**Становішча краін Захаду ў 1924—1929 гадах.** Эканамічнае і ўнутрыпалітычнае развіццё. Перавод эканомікі на выпуск мірнай прадукцыі. Эканамічны ўздым. Адраджэнне эканамічнага патэнцыялу Германіі. Умацаванне парламентарнай сістэмы. Пашырэнне сацыяльнай дзейнасці буржуазных урадаў. Паляпшэнне ўмоў працы, матэрыяльнага становішча рабочых, рост рэфармісцкіх настрояў. Сацыял-дэмакратыя. Камуністычны рух.

Стабілізацыя міжнародных адносін. План Дауэса. Лакарнская канферэнцыя. Нармалізацыя адносін Савецкай Расіі з буйнейшымі краінамі Захаду. Савецка-германскія адносіны. Пакт Брыяна — Келага.

**Сусветны эканамічны крызіс.** Прычыны крызісу, яго глабальны характар і асаблівасці ў розных краінах. Узмацненне ролі дзяржавы ў сацыяльна-эканамічным жыцці. «Новы курс» Ф. Рузвельта ў ЗША.

Палітычнае развіццё заходніх краін ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу. Узмацненне тэндэнцыі да ўстанаўлення таталітарных рэжымаў. Актывізацыя фашысцкіх сіл у Германіі і іншых краінах. Курс сацыял-дэмакратыі на абарону парламентарызму і сістэмы буржуазнай дэмакратыі. Антыфашысцкая дзейнасць камуністычных партый. Абвастрэнне міжнародных адносін пад уздзеяннем сусветнага эканамічнага крызісу. Утварэнне ачагоў вайны.

**Заходні свет напярэдадні другой сусветнай вайны.** Устанаўленне фашысцкай дыктатуры ў Германіі. Буржуазна-дэмакратычнае рэфарматарства ва ўмовах «Новага курса» ў ЗША і Вялікабрытаніі. Кансалідацыя антыфашысцкіх сіл. Прыход да ўлады народных франтоў у Францыі і Іспаніі. Грамадзянская вайна ў Іспаніі і ўстанаўленне дыктатуры Франка.

***Крушэнне Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.*** Курс Германіі на насільны перадзел свету. Утварэнне блока агрэсіўных дзяржаў. Мюнхенская канферэнцыя. Прыняцце СССР у Лігу Нацый. Спробы стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе і іх правал. Савецка-германскі дагавор 1939 года.

**Навука і культура заходніх краін у міжваенны перыяд.** Навукова-тэхнічны прагрэс. Поспехі фундаментальных навук. Матэматыка. Фізіка. Хімія. Астраномія. Асноўныя тэндэнцыі развіцця грамадскіх навук.

Працяг традыцый рэалізму ў літаратуры (Л. Фейхтвангер, А. Маруа). Захапленне рэвалюцыйнай рамантыкай (А. Барбюс, Л. Арагон). Пошукі новых форм (Ф. Кафка, Дж. Джойс, М. Пруст). Выяўленчае мастацтва. Кіно. Архітэктура.

Урок абагульнення. Асноўныя вынікі развіцця краін Захаду ў міжваенны перыяд.

### Тэма 2. Паўднёвыя і заходнія славяне ў міжваенны перыяд (2 г)

**Утварэнне незалежных дзяржаў.** Чэхаславакія, Польшча, Югаславія, Балгарыя. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё славянскіх краін. (Устанаўленне аўтарытарных рэжымаў. Нацыянальныя праблемы. Славянскія краіны ў сістэме міжнародных адносін.) Мюнхенскі дыктат, раздрабненне і акупацыя Чэхаславакіі.

**Культура.** Традыцыі і новыя тэндэнцыі. Развіццё адукацыі, навукі і тэхнікі. Літаратура, тэатр, музыка, выяўленчае мастацтва. Кінематограф. Архітэктура.

### Тэма 3. Гісторыя савецкага грамадства (1917—1941 гады) (11 г)

**Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне Савецкай улады ў Расіі (1917—1921).** Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне. Перамога паўстання ў Петраградзе і Маскве. II з'езд Саветаў і ўтварэнне СНК на чале з Леніным. Рэвалюцыя на фронце і ў нацыянальных раёнах. Першыя рэпрэсіі. Роспуск Станоўчага сходу. Брэсцкі мір.

*Грамадзянская вайна і замежная інтэрвенцыя.* Палярызацыя сіл унутры краіны. Мяцеж белачэхаў. Імперыялістычная інтэрвенцыя. Белы рух. Чырвоная рэспубліка. Палітыка «ваеннага камунізму». Ваенныя дзеянні на франтах грамадзянскай вайны ў 1918—1919 гадах. Ваенна-палітычны саюз рэспублік. Савецка-польская вайна. Разгром арміі Урангеля. (Разгром сіл інтэрвентаў і белагвардзейцаў на ўскраінах краіны.) Прычыны і значэнне, асноўныя этапы, вынікі грамадзянскай вайны.

**СССР на шляху будаўніцтва сацыялізму (1921—1941).** Адносная эканамічная лібералізацыя і пераход да паскоранага будаўніцтва сацыялізму. Пераадоленне Савецкай краінай палітычнай ізаляцыі ў 1920—

1921 гадах. Устанаўленне дыпламатычных зносін з іншымі дзяржавамі. Эканамічны і палітычны крызіс у краіне. Сялянскія паўстанні. Першыя «антыкрызісныя» меры. Сутнасць і значэнне новай эканамічнай палітыкі. Аднаўленне і ўздым народнай гаспадаркі.

***Утварэнне СССР.*** Праекты аб'яднання савецкіх рэспублік. I Усесаюзны з'езд Саветаў. Абвяшчэнне СССР. Канстытуцыя 1924 года. Смерць Леніна і абвастрэнне ўнутрыпартыйнай барацьбы ў сярэдзіне 20-х гадоў.

***Індустрыялізацыя і калектывізацыя ў СССР.*** Ліквідацыя НЭПа і фарсіраваная рэканструкцыя народнай гаспадаркі на прамысловай аснове. Насільнае ажыццяўленне суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа. Масавыя рэпрэсіі ў адносінах да сярэдняга сялянства. Голад у 1932—1933 гадах. Сутнасць калгаснага ладу. Індустрыялізацыя ў 30-я гады. Вынікі і цана індустрыялізацыі. Змена сацыяльнай структуры грамадства.

***Ажыццяўленне культурных пераўтварэнняў.*** Ліквідацыя масавай непісьменнасці і пераход да агульнай абавязковай адукацыі. Стан сярэдняй і вышэйшай школы. (Паскоранае «стварэнне» новай, савецкай інтэлігенцыі.) Навуковыя адкрыцці М. Вавілава, У. Вярнадскага, А. Чыжэўскага, П. Фларэнскага, М. Жукоўскага, А. Фрыдмана і інш. Гістарычная навука. Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва. Сацыялістычны рэалізм. Рускае замежжа. Вынікі культурных пераўтварэнняў у СССР.

***Зацвярджэнне каманднa-адміністрацыйнай сістэмы.*** Сканцэнтраванне заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады ў руках партыйна-дзяржаўнага апарату. Канстытуцыя 1936 года. Разгортванне масавых рэпрэсій.

***Міжнароднае становішча і знешняя палітыка СССР.*** Нарастанне ваеннай небяспекі. Барацьба за захаванне міру, за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі. Уступленне СССР у Лігу Нацый. Дагаворы аб узаемадапамозе з Францыяй і Чэхаславакіяй. Сутычка з японскімі войскамі каля возера Хасан і ракі Халхін-Гол. Англа-франка-савецкія перагаворы 1939 года. Пакт аб ненападзенні з Германіяй (жнівень 1939 года). Савецка-фінская вайна. Пралікі і памылкі знешняй палітыкі.

У р о к  а б а г у л ь н е н н я. Асноўныя вынікі развіцця СССР у 20—30-я гады.

## Тэма 4. Усходнія цывілізацыі паміж сусветнымі войнамі (7 г)

**Кітай.** Палітычнае развіццё Кітая (1918—1924). Перадумовы нацыянальнай рэвалюцыі. («Рух 4 мая». Дзейнасць Сунь Ятсена.) Першы з'езд Гаміньдана. Саюз КПК і Гаміньдана. Рэвалюцыя 1925—1928 гадоў. Пачатак рэвалюцыі. Грамадзянская вайна. Аб'яднанне Кітая пад уладай Гаміньдана (1928). (Ваенныя паходы Чан Кайшы супраць савецкіх раёнаў.) Агрэсія Японіі ў Кітаі.

Новая сістэма народнай адукацыі. Літаратурнае жыццё і тэатр. Лу Сінь. Выяўленчае мастацтва. Музыка. Кіно. Новыя з'явы ў ладзе жыцця.

**Індыя.** Рэвалюцыйны ўздым 1918—1922 гадоў. Рэформы англійскай адміністрацыі. Тактыка Індыйскага нацыянальнага кангрэса (ІНК). Нацыянальна-вызваленчы рух у 20—30-я гады.

Духоўныя і маральныя каштоўнасці. (Гандзізм. Неаіндуізм. Індускае адраджэнне.) Адукацыя і навука. Літаратура. Р. Тагор. Выяўленчае мастацтва, тэатр, музыка і кіно. Народны тэатр. (Новыя з'явы ў каставым ладзе жыцця.)

**Японія.** Эканамічнае развіццё ў 20—30-я гады. (Палітычныя партыі. «Рысавыя бунты». Стварэнне КПЯ.) Землетрасенне 1923 г. Савецка-японскія адносіны. Вашынгтонская канферэнцыя і Японія. Фашызацыя і мілітарызацыя Японіі ў 30-х гадах. Захоп Маньчжурыі. Антыкамінтэрнаўскі пакт. Нападзенне Японіі на Кітай. Узброеныя канфлікты з СССР. Адносіны з Захадам.

Адукацыя і мастацкая культура. Афіцыйная палітыка ў галіне культуры. Духоўнае жыццё. Змяненні ў ладзе жыцця японцаў.

**Мусульманскі свет.** Сацыяльна-палітычнае становішча мусульманскага свету ў 1918—1939 гадах. Нацыянальная рэвалюцыя ў Турцыі (1918—1923).

Барацьба егіпецкага народа за незалежнасць. Дасягненне незалежнасці Афганістанам. Паўстанні ў Іране, Марока, Сірыі, Інданезіі.

Асаблівасці культурнага развіцця мусульманскіх краін.

Урок абагульнення. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці краін Азіі і Афрыкі.

## Раздзел II

## ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА САЮЗА (7 г)

### Тэма 5. Пачатак другой сусветнай вайны. Ваенныя дзеянні ў 1939—1942 гадах (4 г)

**Вайна ў Еўропе.** Прычыны, характар вайны. Напад Германіі на Польшчу і яе разгром. Уступленне ў вайну з Германіяй Англіі і Францыі. Пазіцыя ЗША. Далучэнне да СССР Заходняй Украіны, Заходняй Беларусі. «Дзіўная вайна» ў Заходняй Еўропе. Савецка-фінская вайна. Далучэнне да СССР Прыбалтыйскіх дзяржаў, Паўночнай Букавіны і Бесарабіі. Захоп Германіяй Даніі і Нарвегіі. Капітуляцыя Францыі. Ваенныя дзеянні супраць Англіі. Берлінскі пакт. Вайна ў Афрыцы.

Агрэсія Германіі ў Паўднёва-Усходняй Еўропе і на Блізкім Усходзе.

**СССР напярэдадні вайны. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.** Савецка-германскія адносіны. Савецка-японскі дагавор аб нейтралітэце. Падрыхтоўка Германіі да агрэсіі супраць СССР. Пралікі савецкага кіраўніцтва.

Нападзенне Германіі на Савецкі Саюз. Прычыны паражэння Чырвонай Арміі летам і восенню 1941 года. Правал «маланкавай вайны» супраць СССР. Бітва пад Масквой і яе значэнне.

**Ваенна-палітычныя падзеі другой сусветнай вайны ў 1941—1942 гадах.** Маскоўская канферэнцыя. Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Уступленне ЗША ў вайну. (Пёрл-Харбар.) Агрэсіўныя планы і ваенныя аперацыі Японіі. Ваенныя дзеянні ў зоне Ціхага акіяна. Бітвы на савецка-германскім фронце вясной і летам 1942 года. (Баявыя дзеянні ў Афрыцы і ў Атлантыцы.) Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі. Праблемы другога фронту.

### Тэма 6. Разгром фашысцкага блока (3 г)

**Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і другой сусветнай вайны.** Рашаючыя перамогі Савецкай Арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе. Міжнароднае значэнне разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў пад Сталінградам і Курскам.

**Ваенна-палітычныя падзеі другой сусветнай вайны ў 1943 годзе.** Наступленне саюзных войск у Афрыцы і Міжземнамор'і. Капітуляцыя Італіі. (Вайна на Ціхім акіяне ў Азіі.) Расшырэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя.

**Барацьба з нямецкімі захопнікамі на акупаваных землях.** Асноўныя мэты акупацыйнай палітыкі агрэсараў. Падполле. Партызанскі рух. Рух Супраціўлення ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. (Героі Супраціўлення.)

**Заключны этап вайны.** Наступленне Чырвонай Арміі ў 1944 годзе. Адкрыццё другога фронту. Вызваленне Чырвонай Арміяй еўрапейскіх краін і народаў у 1944—1945 гадах. Крымская канферэнцыя. (Ваенныя дзеянні ў Заходняй Еўропе, Азіі і зоне Ціхага акіяна.) Разгром Германіі і яе капітуляцыя. Заснаванне ААН. Патсдамская канферэнцыя. Уступленне СССР у вайну супраць Японіі і яе разгром. Асноўныя ваенна-палітычныя вынікі другой сусветнай вайны. Сусветна-гістарычнае значэнне перамогі над фашызмам.

## Раздзел III

## КРАІНЫ СВЕТУ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (28 г)

### Уводзіны

Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця пасля другой сусветнай вайны. Фарміраванне «двухполюснай» сістэмы міжнародных адносін. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Глабальныя праблемы і еўрапейская інтэграцыя. Узнікненне новых масавых рухаў.

Канец «халоднай вайны». Разнастайнасць і ўзаемазалежнасць свету.

### Тэма 7. Краіны Захаду (7 г)

**Злучаныя Штаты Амерыкі.** Становішча пасля другой сусветнай вайны. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ЗША ў 50—60-я гады. Паглыбленне рэакцыйнага ўнутрыпалітычнага курсу на пачатку 50-х гадоў. (Макартызм.) Негрыцянская праблема. (Прэзідэнцтва Д. Эйзенхаўэра. Дж. Кенэдзі.) Антываенны рух у 60—70-я гады. Міжнародны эканамічны крызіс сярэдзіны 70-х гадоў і зніжэнне долі ЗША ў сусветнай вытворчасці. Неакансерватыўны курс рэспуб-

ліканцаў у 80-я — на пачатку 90-х гадоў. Перамога дэмакратаў на прэзідэнцкіх выбарах 1992 года.

***Знешняя палітыка ЗША.*** «Халодная вайна». Часовы паварот да разрадкі міжнароднай напружанасці на пачатку 70-х гадоў. Прычыны абвастрэння адносін с СССР і іншымі краінамі Варшаўскага Дагавора на мяжы 70—80-х гадоў. Паварот да новага палітычнага мыслення ў сярэдзіне 80-х гадоў. Адносіны з СССР, краінамі Заходняй Еўропы, іншымі краінамі. Роля ЗША ў сучасным свеце.

Развіццё адукацыі, навукі і культуры. Ідэалогія «амерыканскай выключнасці».

**Вялікабрытанія.** Становішча пасля другой сусветнай вайны. Пачатак распаду Брытанскай каланіяльнай імперыі. Унутраная і знешняя палітыка. Кансерватары і лейбарысты ў 70-я гады. Ірландская праблема.

Змяншэнне долі Англіі ў сусветнай вытворчасці і яе палітычнай ролі. НТР і змяненне сацыяльнай структуры насельніцтва. Унутраная і знешняя палітыка кансерватараў на мяжы 80—90-х гадоў.

Навука і культура.

**Францыя.** Становішча краіны пасля другой сусветнай вайны. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё IV і V Рэспублікі. Ш. дэ Голь. Распад французскай каланіяльнай імперыі. Курс на незалежную знешнюю палітыку. Выхад Францыі з ваеннай арганізацыі НАТА.

Эканамічны ўздым у Францыі ў другой палове 50—60-х гадоў. НТР і змены ў сацыяльнай структуры. Крызіс 1968—1969 гадоў. Унутраная і знешняя палітыка ў 80-я — пачатку 90-х гадоў.

Адукацыя, навука і культура.

**Федэратыўная Рэспубліка Германія.** Утварэнне ФРГ. Дзяржаўны і палітычны лад ФРГ. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ФРГ. «Эканамічны цуд». Берлінскі крызіс 1961 года. Перамога сацыял-дэмакратаў на выбарах 1969 года. В. Брандт. «Новая ўсходняя палітыка».

Германія ў 80-я — на пачатку 90-х гадоў. НТР і змены ў сацыяльнай структуры насельніцтва. Неакансерватыўная палітыка кабінета Г. Коля. Аб'яднанне Германіі.

Навука і культура.

**Італія.** Прагрэсіўныя пераўтварэнні 1945—1947 гадоў. Выбары 1948 года. Сацыяльна-эканамічнае і па-

літычнае развіццё Італіі ў 50-я — на пачатку 90-х гадоў. «Эканамічны цуд». Праблема Поўдня. (Мафія. Палітыка хрысціянскіх дэмакратаў. Правы і левы тэрарызм.) НТР і сацыяльныя зрухі ў сучаснай Італіі. Знешняя палітыка Італіі. Італія ў еўрапейскім супольніцтве.

Развіццё адукацыі, навукі і культуры.

**Краіны Паўночнай Еўропы.** Эканамічнае і палітычнае развіццё (Фінляндыя, Швецыя).

Урок абагульнення. Агульнае і асаблівае ў развіцці краін Захаду пасля другой сусветнай вайны.

### Тэма 8. Міжнародны рабочы рух пасля другой сусветнай вайны (2 г)

**Уздым міжнароднага рабочага руху.** Пашырэнне ўплыву камуністычных партый. Сацыял-дэмакратыя. Уплыў сталінскага кіраўніцтва на міжнародны камуністычны рух.

**Развіццё рабочага руху на сучасным этапе.** Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і змены ў сацыяльнай структуры насельніцтва. Фарміраванне новай сістэмы каштоўнасцей рабочага класа. Рост значэння агульначалавечых, гуманістычных інтарэсаў. Пашырэнне рэфармісцкіх настрояў. Масавы дэмакратычны рух на сучасным этапе.

### Тэма 9. СССР пасля другой сусветнай вайны (8 г)

**СССР у сярэдзіне 40-х — сярэдзіне 60-х гадоў.**

***СССР у пасляваенным дзесяцігоддзі.*** Аднаўленне народнай гаспадаркі. Праблемы эканомікі. Палітычнае жыццё. Масавыя рэпрэсіі. Поспехі і цяжкасці ў развіцці навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва. Знешняя палітыка СССР. Узаемаадносіны СССР і краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. «Халодная вайна».

***Змены ў палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці краіны.*** Смерць І. Сталіна. XX з'езд КПСС. (Спробы адыходу ад сталіншчыны. Паварот у міжнароднай палітыцы ад «халоднай вайны» да мірнага суіснавання.) Аслабленне дыктату СССР і КПСС у сацыялістычным лагеры і міжнародным рабочым руху. «Адліга» і культурнае жыццё ў СССР. Супярэчлівасць і незавершанасць працэсу дэмакратызацыі грамадскага жыцця краіны. Эканамічныя рэформы 50—60-х гадоў.

СССР у сярэдзіне 60-х — пачатку 80-х гадоў.

*Супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага жыцця.* Нарастанне застойных з'яў у эканоміцы і сацыяльнай сферы. Крызісны стан сельскай гаспадаркі. Ускладненне харчовай праблемы. Абвастрэнне экалагічнай абстаноўкі. Спробы паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу: прычыны няўдач і вынікі. Страта тэмпаў развіцця.

***Асаблівасці палітычнага і культурнага жыцця краіны.*** Згортванне дэмакратычных пераўтварэнняў. Развіццё навукі, яе дасягненні і праблемы. Касмічныя даследаванні 70—80-х гадоў. Літаратура і мастацтва. Праваабарончы рух. А. Д. Сахараў, А. І. Салжаніцын. (Дысідэнты. Эміграцыя з СССР.) Раздваенне грамадскай свядомасці, размыванне ідэалаў і маральных асноў. Нарастанне сацыяльнай апатыі.

***Знешняя палітыка: дасягненні і пралікі.*** Асноўныя напрамкі знешнепалітычнай дзейнасці СССР. Праграма міру 70-х гадоў. Дасягненне ваенна-стратэгічнага парытэту з ЗША, яго цана. СССР і сацыялістычныя краіны. («Дактрына Брэжнева».) Увядзенне войск у Афганістан, яго вынікі.

**Крызіс і распад СССР.**

***Спробы «перабудовы» ў краіне.*** Курс на паслядоўную дэмакратызацыю грамадства. Перабудова палітычнай сістэмы. Галоснасць і палітызацыя мас. Адраджэнне духоўнага жыцця. Фарміраванне розных грамадска-палітычных груп і рухаў. Заснаванне прэзідэнцтва. М. С. Гарбачоў. Цяжкасці перабудовы эканомікі. Сацыяльныя праблемы. Абвастрэнне нацыянальнага пытання ў СССР.

***Распад СССР.*** Паглыбленне крызісу грамадства. Правал «перабудовы». Жнівеньскі путч (1991). Крах КПСС. Распад Савецкага Саюза і ўтварэнне незалежных дзяржаў. Узнікненне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Пошукі эканамічнай інтэграцыі.

Урок абагульнення. Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця СССР у пасляваенныя гады. Прычыны распаду СССР.

### Тэма 10. Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы пасля другой сусветнай вайны (2 г)

Рэвалюцыі 40-х гадоў. Фарміраванне палітычных сістэм. Савет Эканамічнай Узаемадапамогі (1949) і

Арганізацыя Варшаўскага Дагавора (1955). Цяжкасці і супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага развіцця. Спробы рэформаў (1956) у Польшчы і Венгрыі. Чэхаславацкі крызіс 1968 года. Наспяванне эканамічнага крызісу ў краінах рэгіёна.

Дэмакратычныя рэвалюцыі канца 80-х гадоў. Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў 90-х гадах.

### Тэма 11. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі пасля другой сусветнай вайны (7 г)

**Кітай.** Утварэнне КНР. Спроба пераадолення эканамічнай адсталасці шляхам «вялікага скачка». (Народныя камуны.) Мэты і характар «культурнай рэвалюцыі». (Культ асобы Мао.) Пагаршэнне савецка-кітайскіх адносінаў. Вынікі «культурнай рэвалюцыі». Праблемы «кітайскай перабудовы». Будаўніцтва сацыялізму з «кітайскай спецыфікай».

Адукацыя і навука. Мастацкая літаратура. Выяўленчае мастацтва. Уплыў «культурнай рэвалюцыі». Новыя маральныя каштоўнасці і з'явы ў ладзе жыцця. Традыцыі канфуцыянства ў сучасным Кітаі.

**Японія.** Унутрыпалітычнае развіццё і міжнароднае становішча. Акупацыйная палітыка ЗША. Рэформы 1945—1949 гадоў. Дэмакратычны і рабочы рух. Узнікненне ліберальна-дэмакратычнай партыі. Падпісанне Сумеснай дэкларацыі СССР і Японіі. Праблема «паўночных тэрыторый». Японскі «эканамічны цуд» і яго прычыны. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага жыцця Японіі 60—90-х гадоў. Адносіны з ЗША, СССР і Кітаем.

Японская сістэма адукацыі. Універсітэты. Літаратурнае жыццё. Выяўленчае мастацтва. Тэатр і кіно. Японскі лад жыцця на сучасным этапе.

**Індыя.** Барацьба за незалежнасць. Абвяшчэнне Рэспублікі Індыя. Сацыяльна-эканамічныя рэформы. Абвастрэнне нацыянальна-рэлігійнага пытання. (Забойства І. Гандзі.) Спробы мадэрнізацыі краіны Р. Гандзі. Дэмаграфічныя праблемы. Узровень жыцця.

Новыя з'явы ў адукацыі. Літаратурнае жыццё. Жывапіс. Архітэктура. Кіно. Р. Капур.

**Паўднёвая Карэя. Сінгапур. Ганконг.** Асаблівасці сацыяльнага развіцця.

**Краіны мусульманскага свету:**

*Егіпет.* Нацыянальна-вызваленчы рух. Ліпеньская рэвалюцыя 1952 года. Войны з Ізраілем. Змена курсу пасля смерці Г. Насэра.

*Алжыр.* Нацыянальна-вызваленчая вайна 1954—1962 гадоў. Утварэнне Алжырскай Народна-дэмакратычнай Рэспублікі. Пераварот 1965 года. «Сацыялістычная арыентацыя». (Рост уплыву ісламскіх фундаменталісцкіх сіл.)

*Ірак.* Палітыка Англіі ў Іраку. Рэвалюцыя 1958 года. Палітычная нестабільнасць. Курдская праблема. «Сацыялістычная арыентацыя». Ірак на сучасным этапе.

*Іран.* Барацьба іранскага народа супраць палітыкі Англіі. Масадык. «Белая рэвалюцыя шаха і народа». Антыманархічная рэвалюцыя 1978—1979 гадоў. Тэакратычны рэжым. (Ісламскі фундаменталізм.)

*Турцыя.* Сацыяльна-эканамічныя праблемы. Палітычная нестабільнасць. Ваенны пераварот 1980 года. Змены ў палітычным ладзе. Прыход да ўлады Партыі Бацькаўшчыны. Турэцкі «эканамічны цуд».

*Культура і лад жыцця пасля 1945 года.* Асноўныя тэндэнцыі. Новыя з'явы.

**Краіны Лацінскай Амерыкі. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё.** Праблема пераадолення эканамічнай адсталасці. Сацыяльная сітуацыя. Палітычныя рэжымы (Бразілія, Аргенціна, Мексіка). Адносіны з ЗША. Кубінская рэвалюцыя.

Эканамічнае і палітычнае становішча на сучасным этапе. Праблема мадэрнізацыі эканомікі і сацыяльнай структуры. Знешняя запазычанасць шэрага краін. (Пытанне аб ролі дыктатарскіх рэжымаў: Чылі, Аргенціна і інш.) Вопыт развіцця Кубы на шляху сацыялізму.

### Тэма 12. Лакальныя войны і канфлікты пасля другой сусветнай вайны (2 г)

*Войны ў В'етнаме.* Вызваленчая вайна в'етнамскага народа супраць французскіх інтэрвентаў. Жэнеўскія пагадненні. Вайна ЗША ў В'етнаме. Парыжскія пагадненні.

*Блізкаўсходні канфлікт.* Утварэнне дзяржавы Ізраіль. Араба-ізраільскія войны. Палесцінская праблема. Перагаворы па ўрэгуляванню блізкаўсходняга канфлікту.

***Карэйская вайна.*** Сутыкненне інтарэсаў ЗША і СССР у Карэі. Ваенныя дзеянні ў 1950—1953 гадах. Роля ААН у вайне. Удзел у вайне КНР. Вынікі вайны.

***Вайна ў Афганістане.*** Абвастрэнне сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Афганістане напрыканцы 70-х гадоў. Увод савецкіх войск у снежні 1979 года. Грамадзянская вайна. Вывад савецкай арміі з Афганістана. Прыход маджахедаў да ўлады.

***Войны ў зоне Персідскага заліва.*** Ірана-іракская вайна 1980—1988 гадоў. Кувейцкі крызіс. Захоп Кувейта Іракам. Ваенныя дзеянні ЗША і Захаду супраць Ірака. Вынікі вайны.

Урок абагульнення. Асноўныя вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця «трэцяга свету» пасля 1945 года.

## Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Змены на палітычнай карце свету ў XX стагоддзі. Галоўныя напрамкі барацьбы народаў Заходняй Еўропы, Амерыкі і Усходу за сацыяльны прагрэс і нацыянальнае вызваленне.

Тэндэнцыі эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця Расіі і СССР у XX ст.

Асноўныя рысы і дынаміка сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця краін Еўропы, Амерыкі і Усходу. Разнастайнасць палітычных сістэм.

Тэндэнцыі ў развіцці міжнародных адносін у другой палове XX ст. Праблемы «вайны і міру», глабальныя праблемы чалавецтва. «Сусветная садружнасць». Рэгіянальнае і міжнароднае супрацоўніцтва ў вырашэнні глабальных праблем сучаснасці.

Катэгорыі «лідэр», «партыя», «сацыяльная група», «сацыяльны рух», «спосаб жыцця» і інш.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ НАВЕЙШАГА ЧАСУ (З 1917 года да нашых дзён)

## 34 гадзіны (У тым ліку 3 гадзіны — рэзервовы час)

### Раздзел І

### КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ. БАРАЦЬБА ЗА СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (4 г)

#### Тэма 1. На шляху да ўлады Саветаў (ліпень 1917— сакавік 1918 года) (2 г)

**Абвастрэнне палітычнай сітуацыі. Кастрычніцкая рэвалюцыя.** Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве. Барацьба з карнілаўшчынай. Бальшавізацыя Саветаў. Бальшавіцкі ВРК Заходняй вобласці і фронту. Кастрычніцкія падзеі ў Мінску, Віцебску, Гомелі і іншых гарадах Беларусі. Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве. Стварэнне Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці (Аблвыканкамзаха).

**Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Абвяшчэнне БНР.** Ліпеньскі (1917) з'езд беларускіх арганізацый і яго рашэнні. Дзейнасць Цэнтральнай рады. Адносіны нацыянальна-дэмакратычных партый і інтэлігенцыі Беларусі да бальшавіцкай улады. Усебеларускі з'езд і яго разгон. Брэсцкі мір. Наступленне немцаў, захоп імі новых тэрыторый на Беларусі. Дзейнасць Выканкама Усебеларускага з'езда і віленскіх беларускіх арганізацый. Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Дзейнасць Рады і Народнага сакратарыяту БНР.

#### Тэма 2. Беларусь у гады замежнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны (сакавік 1918— 1920 гады) (2 г)

**Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі. Абвяшчэнне БССР.** Германскі акупацыйны рэжым. Барацьба з акупантамі. Беларускае пытанне ў палітыцы бальшавікоў. І з'езд Камуністычнай партыі Беларусі. Абвяшчэнне Беларускай ССР. Фарміраванне ўрада БССР (З. Жылуновіч). Ліквідацыя БССР і ўтварэнне

Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел). Далучэнне Віцебскай і Магілёўскай губерняў да РСФСР. Палітыка «ваеннага камунізму».

**Барацьба з інтэрвенцыяй Польшчы. Другое абвяшчэнне БССР.** Наступленне польскіх войск. Палітыка польскага ўрада ў дачыненні да БНР. Барацьба з польскай інтэрвенцыяй. Новае наступленне Польшчы і контрнаступленне Чырвонай Арміі. Дагавор РСФСР з Літвою. Другое абвяшчэнне БССР. Канфрантацыя КП(б)Б з беларускімі эсэрамі. Заключэнне РСФСР Рыжскага мірнага дагавора з Польшчай і падзел Беларусі. Трагічныя вынікі вайны.

## Раздзел II

## МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД. ПАДЗЕЛЕНАЯ БЕЛАРУСЬ (9 г)

### Тэма 3. Савецкая Беларусь у 20-я гады (3 г)

**НЭП у БССР.** Асаблівасці пасляваеннай сітуацыі ў Беларусі. Абвастрэнне гаспадарчага крызісу. Увядзенне новай эканамічнай палітыкі. Аднаўленне сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Кааператыўны рух. Вынікі аднаўленчага перыяду. (Праблема метадаў гаспадарчага будаўніцтва.) Непаслядоўнасць НЭПа і перадумовы яго згортвання.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Адносная дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця. Ажыўленне работы Саветаў. Дзейнасць рабоча-сялянскай інспекцыі. Партыя і прафсаюзы. Вяртанне на радзіму эмігрантаў — дзеячаў беларускай культуры.

Пагадненні паміж БССР і РСФСР і іншымі рэспублікамі. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза ССР. Дагавор аб утварэнні СССР, аб правах саюзных рэспублік. Пашырэнне межаў БССР. Канстытуцыя Беларускай ССР 1927 г.

**Палітыка беларусізацыі. Развіццё культуры.** Арганізацыя культурна-асветнай работы. Меры па ліквідацыі непісьменнасці. Станаўленне нацыянальнай сістэмы адукацыі. Інстытут беларускай культуры (У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, У. Пічэта і інш.). Развіццё краязнаўства. Распрацоўка тэрміналогіі беларускай мовы. Літаратурныя аб'яднанні. Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, М. Гарэцкі, З. Бядуля, К. Чорны, У. Дубоўка і інш. Новыя напрамкі ў мастацтве (У. Галу-

бок, Я. Міровіч, Н. Сакалоўскі, Ю. Тарыч, М. Філіповіч і інш.).

### Тэма 4. БССР у канцы 20-х і ў 30-я гады (3 г)

**Усталяванне адзінай дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці.** Згортванне НЭПа і пашырэнне каманднага кіравання гаспадаркай. Ажыццяўленне індустрыялізацыі. Укараненне розных форм спаборніцтва. Стаханаўскі рух. Вынікі і цана індустрыялізацыі.

Пачатак калектывізацыі. 1929 год — «год вялікага пералому». Супраціўленне сялянства. Дваццаціпяцітысячнікі. Рэпрэсіі супраць сялян. Палітаддзелы МТС. Вынікі калектывізацыі.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Цэнтралізацыя кіраўніцтва гаспадаркай. Бюракратызацыя грамадска-палітычнага жыцця. Палітычныя працэсы. Пазасудовыя расправы. Курапаты.

**Культурныя пераўтварэнні.** Ліквідацыя масавай непісьменнасці. Пашырэнне школьнай адукацыі. Стварэнне сеткі рабфакаў, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў. Рэарганізацыя Інстытута беларускай культуры ў Акадэмію навук БССР. Згортванне беларусізацыі. Рэформа беларускага правапісу. Барацьба з «нацдэмамі». Трагічны лёс старэйшага пакалення беларускай інтэлігенцыі (У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, Я. Лёсік, В. Ластоўскі і інш.).

Развіццё навукі. Першы з'езд пісьменнікаў БССР. Асноўныя матывы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў у 30-я гады. Тэатральнае мастацтва (У. Уладамірскі, Г. Глебаў, І. Ждановіч, А. Ільінскі, У. Крыловіч, П. Малчанаў, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая). Кінафільмы 30-х гадоў (У. Корш-Саблін). Музыка (А. Багатыроў, В. Залатароў, М. Аладаў, Я. Цікоцкі). Беларускае опернае і балетнае мастацтва (Л. Александроўская; Р. Млодак). Вядучыя тэмы выяўленчага мастацтва (У. Волкаў, Я. Зайцаў, З. Азгур). Архітэктура (У. Вараксін, А. Воінаў, І. Лангбард). Змены ў абліччы гарадоў.

### Тэма 5. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР (3 г)

**Становішча Заходняй Беларусі. Барацьба за нацыянальнае вызваленне і паляпшэнне ўмоў жыцця.** Насаджэнне асадніцтва і паланізацыя. Стан сельскай

гаспадаркі. Галіновая структура прамысловасці. Матэрыяльнае становішча працоўных мас. Беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі. Партызанскі рух у першыя гады польскага панавання. Дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ). Б. Тарашкевіч. (Стварэнне пасольскага клуба «Змаганне».) Таварыства беларускай школы (ТБШ). Нацыянальны друк.

Супрацiўленне польскай рэакцыі ў 30-я гады. Праблема стварэння адзінага антыфашысцкага фронту за мір і дэмакратыю.

Пакт Молатава — Рыбентропа і лёс Заходняй Беларусі. Агрэсія фашысцкай Германіі супраць Польшчы. Уступленне савецкіх войск на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Новы дагавор СССР з Германіяй. Перадача Вільні Літве. Устанаўленне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні. Рэпрэсіі.

**Беларускае замежжа ў 20—30-я гады.** Замежныя цэнтры эміграцыі беларусаў. Беларуская дыяспара ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе, ЗША, Канадзе і іншых краінах. Палітычныя і культурна-асветныя арганізацыі. Іх узаемадачыненні і адносіны да БССР. Рашэнне кіраўніцтва БНР аб прызнанні БССР нацыянальнай дзяржавай беларускага народа. Рух за вяртанне на радзіму. Трагічны лёс рээмігрантаў.

**Наш край у 1917—1939 гадах.**

## Раздзел III

## БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (4 г)

### Тэма 6. Нямецка-фашысцкая акупацыя БССР (1 г)

Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Абарончыя баі Чырвонай Арміі на Беларусі. Брэсцкая крэпасць. Бітва пад Мінскам. Будаўніцтва абарончых аб'ектаў. Народнае апалчэнне. Баі пад Бабруйскам, Оршай, Віцебскам, Магілёвам, Гомелем. Вынікі двухмесячных бітваў савецкіх войскаў у Беларусі.

Акупацыя Беларусі і яе расчляненне. Акупацыйны апарат кіравання. Калабарацыяністы. Фашысцкая палітыка генацыду. Рэалізацыя плана «ОСТ». Карныя

экспедыцыі. Канцэнтрацыйныя лагеры і турмы. Гета. Вываз насельніцтва на работу ў Германію.

### Тэма 7. Беларусь у барацьбе з фашысцкай Германіяй (2 г)

**Масавая барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў.** Першыя падпольныя камітэты і партызанскія атрады. Наладжванне дзейнасці КП(б)Б ва ўмовах акупацыі. Мінскае падполле. Дыверсійная работа на чыгуначным вузле Орша.

Развіццё падпольнага руху. Барацьба з акупантамі ў Мінску, Магілёве, Віцебску. Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Супраціўленне ў гета. Стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР). Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. «Рэйкавая вайна». Характар дзейнасці польскай Арміі Краёвай у Заходняй Беларусі; яе ўзаемаадносіны з савецкімі партызанамі. Дапамога савецкага тылу і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам. Інтэрнацыянальны характар барацьбы з захопнікамі. Страты, нанесеныя акупантам.

**Вызваленне Беларусі.** Пачатак вызвалення. Сумесныя дзеянні партызан з часцямі Чырвонай Арміі. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Акружэнне і разгром фашысцкіх груповак пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам. Вызваленне Мінска. Подзвігі савецкіх воінаў. Поўнае выгнанне нямецка-фашысцкіх войск з тэрыторыі БССР. Значэнне разгрому гітлераўцаў у Беларусі. Беларусы-франтавікі. Аднаўленчыя работы ў галінах народнай гаспадаркі і культуры. Уклад беларусаў у агульную барацьбу супраць фашысцкіх захопнікаў. Страты Беларусі ў вайне.

**Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны.** Нашы землякі — героі фронту і тылу.

## Раздзел IV

## БЕЛАРУСЬ У 1945—1995 гадах (14 г)

### Тэма 8. ПЕРАХОД ДА МІРНАГА ЖЫЦЦЯ (1945—1953 гады) (3 г)

**Аднаўленне эканомікі і даваеннай мадэлі эканамічнага развіцця.** Становішча народнай гаспадаркі ў першыя пасляваенныя гады. Прамысловасць, транспарт,

сувязь. Асаблівасці аднаўленчага працэсу. Стварэнне ў рэспубліцы новых галін прамысловасці.

Калгасны лад. Калектывізацыя ў заходніх абласцях.

**Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё.** Рэпрэсіі ў адносінах да рэпатрыяваных, былых ваеннапалонных, дзеячаў навукі і культуры рэспублікі.

Літаратура. Друк. Культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі. Роля партыі і народных мас у дзяржаўным і грамадскім жыцці рэспублікі.

**Удзел Беларусі ў заснаванні і дзейнасці ААН.** Замежныя сувязі. Савецкая стратэгія ў адносінах да ААН і яе вынікі. Уключэнне БССР у склад краін-заснавальніц ААН. Удзел урадавай дэлегацыі БССР у распрацоўцы Статута ААН. Дзейнасць БССР ў ААН.

Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя перашкоды на шляху развіцця замежных сувязей БССР. Гандлёва-эканамічныя і культурныя сувязі рэспублікі з іншымі краінамі. Прадстаўніцтва БССР у міжнародных культурна-асветных установах.

### Тэма 9. Беларусь у перыяд палітычнай «Адлігі» (1953—1964 гады) (4 г)

**Спробы лібералізацыі палітычнай сістэмы.** Спыненне масавых рэпрэсій і пачатак рэабілітацыі іх ахвяраў. Змяненні ў жыццядзейнасці партыйнай арганізацыі, Саветаў, прафсаюзаў, камсамола рэспублікі. Асноўныя напрамкі і вынікі рэарганізацыі палітычнай сістэмы. Адноснасць і непаслядоўнасць лібералізацыі. Формы праяўлення сацыяльнай актыўнасці працоўных.

**Рэформы эканомікі і іх вынікі. Новы этап індустрыяльнага развіцця рэспублікі.** Рост прамысловай вытворчасці. Змены ў структуры прамысловасці і тэхналогіях. Павышэнне ўзроўню механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці. Праблемы экалогіі. Эканамічныя меры па развіццю сельскай гаспадаркі. Арганізацыя сістэмы аграбіялагічнай дапамогі калгасам і саўгасам, умацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. Павелічэнне валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі.

**Паляпшэнне матэрыяльнага становішча працоўных. Змены ў сацыяльнай структуры грамадства.** Рост нацыянальнага даходу і даходаў насельніцтва — заробнай платы, выплат і льгот з грамадскіх фондаў спажывання. Змены ў аплаце працы калгаснікаў. Увядзенне пенсіённага забеспячэння калгаснікаў.

Georg-Eckert-Institut
für internationale
Schulbuchforschung
Braunschweig
-Schulbuchbibliothek -

Паляпшэнне жыллёвых умоў, бытавога абслугоўвання насельніцтва. Узровень жыцця.

Змены ў сацыяльнай структуры грамадства. Павышэнне прафесійнага і адукацыйнага ўзроўню працоўных.

**Культурнае жыццё рэспублікі.** Змены ў формах і метадах кіраўніцтва культурай. Рост творчых саюзаў. Рэабілітацыя творчасці пісьменнікаў — ахвяраў палітычных рэпрэсій. Дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры, тэатра, музычнага і выяўленчага мастацтва.

Увядзенне абавязковай 8-гадовай адукацыі. Развіццё сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Курс на ўмацаванне сувязі школы з жыццём. Важнейшыя дасягненні ў развіцці навукі.

### Тэма 10. Ад рэформ да стагнацыі. Наспяванне крызісу (1965—1985 гады) (3 г)

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Дзейнасць партыі, Саветаў, прафсаюзаў і камсамола ў Беларусі ў гэты перыяд. Формы партыйнага кіраўніцтва грамадска-палітычным жыццём. Дысідэнцкі рух і барацьба з ім.

**Развіццё народнай гаспадаркі.** Дэмаграфічныя змены. Урбанізацыя і яе вынікі. Эканамічная рэформа 1965 года. Прычыны яе правалу. Пераважнае развіццё цяжкай і абароннай прамысловасці.

Рост капіталаўкладанняў у аграрны сектар. Пашырэнне тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі, хімізацыя і меліярацыя. Стварэнне аграпрамысловых комплексаў. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі на буйнамаштабнай вытворчасці мясной прадукцыі. Экстэнсіўны характар гаспадарання. Абвастрэнне экалагічнай абстаноўкі. Неабходнасць эканамічных рэформаў.

**Адукацыя і культура.** Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Развіццё прафесіянальна-тэхнічнага навучання, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Арганізацыя і асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў. Праблема ўкаранення іх вынікаў у народную гаспадарку. Стан грамадскіх навук.

Важнейшыя дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры, тэатра, кінематаграфіі, музычнага і выяўленчага мастацтва, архітэктуры.

Выдавецкая дзейнасць. Сродкі масавай інфармацыі. Бібліятэкі. Музеі.

Сістэма партыйна-палітычнай асветы. Масавая культура і свядомасць.

**Тэма 11. На шляху да суверэнітэту і незалежнасці (1986—1995 гады) (4 г)**

**Эканамічнае становішча Беларусі ў другой палове 80-х — пачатку 90-х гадоў.** Паглыбленне крызісных з'яў у эканоміцы. Пошук шляхоў перабудовы эканамічных адносін. Правал спробы радыкальнай эканамічнай рэформы пры захаванні дзяржаўнай формы ўласнасці на сродкі вытворчасці. Становішча ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы рэспублікі. Эканамічныя праблемы Беларусі ў сувязі з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС.

Аб'ектыўная непазбежнасць пераходу ад планава-каманднай да рыначнай эканомікі. Першыя законы аб пераўтварэннях эканомікі ў рынкавым накірунку, цяжкасці іх ажыццяўлення. Развал эканомікі.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Абвастрэнне крызісу савецкай сістэмы. Рост апазіцыйных рухаў. Першыя крокі да рэальнай дэмакратыі. Шматпартыйнасць. Асаблівасці развіцця дэмакратычных працэсаў у Беларусі.

**Абвяшчэнне суверэннай і незалежнай Рэспублікі Беларусь.** Узмацненне руху за нацыянальнае адраджэнне і суверэнітэт Беларусі. Дэкларацыя Вярхоўнага Савета БССР ад 27 ліпеня 1990 года аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнай барацьбы вакол новага саюзнага дагавора. Жнівеньскія падзеі 1991 года. Заканадаўчае афармленне дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Пагадненне ад 8 снежня 1991 года аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Увядзенне прэзідэнцкай формы кіравання краінай. Выбранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Праблемы выхаду з сацыяльна-эканамічнага крызісу.

**Рэспубліка Беларусь у сусветным супольніцтве на сучасным этапе.** Знешняя палітыка Беларусі пасля абвяшчэння незалежнасці. Узаемаадносіны з краінамі СНД, Прыбалтыйскімі рэспублікамі і Польшчай. Курс на нейтралітэт. Абвяшчэнне без'ядзернага ста-

туса. Праблема энерганосьбітаў. Дагавор аб калектыўнай бяспецы. Дзайнасць у ААН.

**Перабудова гандлёва-эканамічных сувязей.** Устанаўленне прадпрыемствамі і аб'яднаннямі Беларусі прамых вытворчых і навукова-тэхнічных сувязей. Развіццё сувязей у галіне навукі і культуры.

**Развіццё культуры.** Сцвярджэнне галоснасці ў грамадскім жыцці. Навука. Адукацыя.

Літаратура і мастацтва Беларусі на сучасным этапе. Пазіцыі праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла ў Беларусі. Здабыткі, цяжкасці і праблемы на шляху культурнага развіцця.

**Наш край у 1945—1995 гадах.**

## Агульнагістарычныя веды (паняцці, праблемы, ідэі)

Перыядызацыя гісторыі Беларусі 1917—1995 гадоў.

Асаблівасці ўстанаўлення дыктатуры пралетарыяту на Беларусі.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у ліпені — лістападзе 1917 года. Пазіцыі бальшавікоў па беларускім пытанні. Брэсцкі мірны дагавор і Беларусь. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе кіраўніцтва.

Утварэнне БССР. Савецка-польская вайна. Падзел Беларусі па Рыжскім мірным дагаворы.

БССР у 20—30-я гады. Усталяванне таталітарнага рэжыму. Масавыя рэпрэсіі. Асаблівасці развіцця культуры.

Становішча Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы. Нацыянальна-вызваленчая барацьба. Міжнародныя адносіны ў канцы 30-х гадоў і аб'яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

Нямецка-фашысцкая акупацыя БССР і расчляненне Беларусі. Масавая барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Падполле. Партызанскі рух. Страты Беларусі ў другой сусветнай вайне.

Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага, грамадскапалітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе і ў перыяд палітычнай «адлігі».

Экстэнсіўны характар эканомікі. Экалагічныя праблемы. Развіццё адукацыі і культуры. Неабходнасць карэнных рэформаў.

Спробы перабудовы эканомікі і іх правал. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця.

Крызіс савецкага грамадства. Шматпартыйнасць. Распад СССР. Утварэнне суверэннай і незалежнай Рэспублікі Беларусь. Праблемы выхаду з сацыяльна-эканамічнага крызісу і ўмацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

## Асноўныя ўменні вучняў

Суадносіць гістарычныя з'явы з пэўнымі перыядамі гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі;

аналізаваць, абагульняць і ацэньваць гістарычныя факты, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі з'явамі;

працаваць з гістарычнымі дакументамі, навукова-папулярнай і даведачнай літаратурай, параўноўваць інфармацыю розных крыніц;

аналізаваць змест гістарычнай карты, абагульняць і прымяняць гэтыя веды;

фармуляваць вызначэнні асобных гістарычных паняццяў;

даваць параўнальную характарыстыку гістарычных падзей, аргументаваць свае адносіны да іх;

састаўляць план-канспект параграфа падручніка, рыхтаваць даклад, выступаць з ім;

удзельнічаць у абмеркаванні і дыскусіях па гістарычных праблемах.

# ЗМЕСТ


Тлумачальная запіска . . . . . . . . . . . . . . 3

5 клас . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10

Гісторыя старажытнага свету . . . . . . . . . . 10

Гісторыя Беларусі старажытных часоў . . . . . . . 16

6 клас . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20

Гісторыя сярэдніх вякоў . . . . . . . . . . . 20

Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі . . . . . . . . 27

7 клас . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

Сусветная гісторыя новага часу . . . . . . . . . 33

Гісторыя Беларусі новага часу . . . . . . . . . 40

8 клас . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46

Сусветная гісторыя новага часу . . . . . . . . . 46

Гісторыя Беларусі новага часу . . . . . . . . . 55

9 клас . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63

Сусветная гісторыя навейшага часу . . . . . . . 63

Гісторыя Беларусі навейшага часу . . . . . . . . 76


(86)

Вучэбнае выданне

**ПРАГРАМЫ ПА ГІСТОРЫІ**
**для базавых агульнаадукацыйных школ**

Адказны за выпуск К. ТАРАСАЎ

Здадзена ў набор 02.08.95. Падпісана ў друк 20.08.95. Фармат 84×108/32. Папера друк. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 4,2. Ум. фарб.-адб. 4,3. Ум.-выд. арк. 4,73. Наклад 10 000 экз. Заказ 927.

Выдавецтва ТАА «Аракул». Ліцэнзія ЛВ № 105.
220005, Мінск, вул. Пугачоўская, 1.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79.

ДЛЯ НАТАТАК